Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЛЮТАГА 2017 г. ЧАЦВЕР № 37 (28401)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СВЯТА, АВЕЯНАЕ МУЖНАСЦЮ

Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры!

Дарагія ветэраны! Паважаныя суграмадзяне!

Ад усёй душы віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Гэта свята, авеянае мужнасцю і доблесцю, мы заўсёды адзначаем з асаблівым пачуццём гордасці за нашых воінаў, якія ва ўсе часы надзейна забяспечвалі абараназдольнасць краіны і цяпер прадаўжаюць дастойна ахоўваць рубяжы нашай Радзімы.

Беларусь удзяляе першарадную ўвагу абароне нацыянальных інтарэсаў. У рэспубліцы створана надзейная сістэма бяспекі, ажыццяўляецца далейшае ўмацаванне Узброеных Сіл, удасканальваецца баявая падрыхтоўка ваеннаслужачых.

Асаблівыя словы ўдзячнасці — ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Сваёй самаадданасцю і гераізмам яны прадэманстравалі цяперашняму пакаленню салдат і афіцэраў прыклад сапраўднага патрыятызму і вернасці воінскаму абавязку.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту і новых здзяйсненняў на карысць роднай Беларусі!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Алена ПЛІС, дырэктар інфармацыйна-турысцкага цэнтра «Мінск»:

«З увядзеннем пяцідзённага бязвізавага рэжыму ў Мінску чакаюць павелічэння прытоку турыстаў як мінімум на 15—20%. Акрамя традыцыйных праграм, якія сёння турфірмы прапануюць замежным грамадзянам, распрацоўваюцца новыя ідэі, што змогуць прыцягнуць дадатковыя патокі турыстаў, пазнаёміць іх з традыцыямі Беларусі, нацыянальнай культурай і звычаямі. Таксама разглядаюцца магчымасці рэалізацыі новых праектаў, звязаных з аграэкатурызмам, арганічнай сельскай гаспадаркай».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.02.2017 г.

Долар ЗША	1,8723 ▼
Еўра	1,9698 ▼
Рас. руб.	0,0325 ▲
Укр. грыўня	0,0693 ■

ISSN 1990 - 763X

■ На варце Айчыны

Зачараваныя небам

У ваенных верталётчыкаў, бацькі і сына Паўлавых, на дваіх — больш як 5 тысяч гадзін, праведзеных над аблокамі

Фота Надзеі БУЖАН.

Яны ўдвух зачараваныя небам і не ўяўляюць сваё жыццё без вінтакрылых машын. Нягледзячы на тое, што Аляксандр Мікалаевіч сваё ўжо адлятаў, яго ўсё роўна цягне туды, дзе свішча вецер і гудзе матор. Выйшаўшы на ваенную пенсію, лётчык-снайпер прымяняе свой багаты вопыт у распрацоўцы авіятрэнажораў. Затое за дваіх лятае яго сын, які служыць у 50-й змешанай авіяцыйнай базе, што ў прысталічных Мачулішчах.

АД ЗАХАПЛЕННЯ ДА ВЫШЭЙШАГА ПІЛАТАЖУ

А пачалося ўсё са звычайнага юнацкага захаплення авіяцыяй, якое вылілася ў паступленне ў Сызранскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў.

— Здаралася, што ў школе прагульваў заняткі, — расказвае старэйшы Паўлаў. — Калі настаўнікі прасілі мяне растлумачыць прычыну, я казаў, што быў у ваенкамаце. І нехта нават пажартаваў: маўляў, лётчыкам будзеш, раз часта ў ваенкамаце бываеш!

Так і атрымалася. Праўда, стаў Аляксандр Паўлаў не лётчыкам, а верталётчыкам. Аб тым, што ў вучылішчы рыхтуюць кіраваць верталётамі, даведаўся, ужо калі быў залічаны ў рады курсантаў. Але аб гэтым ніколі не пашкадаваў.

Свой самы першы палёт старэйшы Паўлаў памятае і сёння. Было гэта на верталёце Мі-2. «Ляцелі тады з інструктарам, маладым лейтэнантам, які сам нядаўна скончыў вучылішча, — успамінае лётчык-снайпер. — Я сядзеў і трымаўся за кіраванне, ён пілатаваў. Потым і мне даў патрымацца за штурвал. Цікава было. Усё гэта вельмі заваражыла...»

Пасля заканчэння вучылішча ў Сызрані найлепшых выпускнікоў адпраўлялі служыць за мяжу. Аляксандр Паўлаў трапіў у Манголію. Ва Улан-Батары быў адразу прызначаны камандзірам экіпажа (авіятары з вышэйшай адукацыяй па тым часе былі ў дэфіцыце), а праз тры гады стаў лётчыкам першага класа.

СТАР. 4

■ Эксклюзіў

У ПОШУКАХ СТАБІЛЬНАГА «КВАДРАТА»

Жыллёвыя крэдыты — на агульных падставах, дзяржаўная падтрымка — індывідуальна

Сёлета ў сярэдзіне студзеня адпаведнай пастановай Саўміна быў зацверджаны комплекс мер па рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020-я гады. У прыватнасці, у дакуменце гаворыцца, што для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, будзе прадугледжана замена льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва крэдытаваннем на рынкавых умовах з адраснай дзяржаўнай падтрымкай такіх асоб за кошт бюджэтных сродкаў. Пастанова ўдакладняе, што пераход да новага прынцыпу фінансавання жыллёвага будаўніцтва для «чаргавікоў» будзе рэалізаваны на працягу года.

Якім чынам будзе працаваць новая сістэма дзяржпадтрымкі, а таксама аб планах спецыялістаў па будаўніцтве жылля ў нашай краіне на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказаў **начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

— Адразу паспрабуем падсумаваць, колькі ў краіне было пабудавана жылля летась і на якія аб'ёмы спецыялісты міністэрства разлічваюць сёлета?

— Летась у Беларусі было пабудавана 4 млн 286 тысяч квадратных метраў жылля, — гэта на 7,1% больш за гадавы план. Заданне па жыллю з дзяржаўнай падтрымкай было перавыканана ажно на 18% (узведзена 991,3 тысячы квадратных метраў жылля).

СТАР. 2

У ПОШУКАХ СТАБІЛЬНАГА «КВАДРАТА»

Фота БЕЛТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета запланавана толькі 3,5 млн «квадратаў», фінансаванне з боку дзяржавы разлічана на 375 тысяч квадратных метраў. Атрымліваецца, што для льготнікаў з дзяржпадтрымкаю будзе пабудавана жылля прыкладна ў 2,5 раза менш, чым летась.

— А як будзе вырашацца праблема забеспячэння жыллём шматдзетных сем'яў?

— Справа ў тым, што ў нас прыкладна 26 тысяч шматдзетных сем'яў, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. З іх каля 6,5 тысячы сям'яў стаяць на гэтым уліку больш за 3 гады.

Таму запланавана пабудаваць 4,3 тысячы кватэр для шматдзетных сем'яў, або 260 тысяч квадратных метраў жылля з дзяржпадтрымкай. Больш за тое, заўважу, што яны будуць будаваць сабе жыллё па ранейшых умовах, якія прапісаны ва Указе кіраўніка дзяржавы №13.

— Цяпер урад спрабуе адшукаць дадатковыя рэсурсы для ажыўлення рынку будаўніцтва жылля...

— Сёлета, напрыклад, на гэтыя мэты накіраваны так званыя паўільготныя крэдыты ад Белаграпрамбанка і Беларусбанка з адносна невысокімі для насельніцтва працэнтамі. Але грошай па такіх крэдытных лініях няшмат, і на масавага спажыўца яны не разлічаны. У першую чаргу такія мэтавыя крэдыты падтрымаюць чаргавікоў-«афганцаў» і іншых былых удзельнікаў ваенных дзеянняў на тэрыторыі замежных краін.

— У найбліжэйшай будучыні будзе распрацаваны новы механізм фінансавання жыллёвага будаўніцтва з дзяржпадтрымкай. Чытачы нашай газеты хвалююцца, што для большай часткі чаргавікоў гэтую дапамогу проста могуць адмяніць...

— Зараз спецыялістамі распрацоўваецца схема будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай, якая пачне дзейнічаць не раней за другую палову 2017 года. Заўважу, што сёння перад банкаўскай сістэмай з удзелам Мінфіна (размеркаванне бюджэту) пастаўлена задача адшукаць адпаведныя рэсурсы, каб і надалей захаваць ільготныя ўмовы будаўніцтва жылля (у першую чаргу для шматдзетных) па аналогіі з ужо дзеючымі.

У краіне налічваецца прыкладна 26 тысяч шматдзетных сем'яў, якія стаяць на ўліку, з іх каля 6,5 тысячы — больш за 3 гады.

— Якім яшчэ катэгорыям чаргавікоў можна будзе разлічваць на адрасную дзяржпадтрымку па новай схеме?

— У заканадаўстве прапісаны 15 катэгорый чаргавікоў, якія маюць права атрымліваць у той ці іншай ступені дзяржаўную падтрымку пры будаўніцтве жылля. Яны застануцца і надалей. Цяпер не ставіцца задача, каб кагосьці адтуль выкрасліць. Заўважу, што і цяпер дзяржаўная падтрымка прадастаўляецца ў нас цалкам адрасна. Агулам ільготныя крэдыты і цяпер ніхто не атрымлівае.

Сёння, напрыклад, шматдзетная сям'я плаціць па крэдыце пэўную суму і нават не ведае, колькі гэта жыллё рэальна каштуе дзяржаве. А па новай схеме чалавек будзе ўжо ведаць, на які аб'ём дапамогі ад дзяржавы ён можа разлічваць, які крэдыт атрымае і як з дапамогай грошай дзяржавы гэты крэдыт пагасіць. Чаргавік будзе бачыць усю фінансавую кухню свайго будаўніцтва. Напрыклад, кліент ужо будзе дакладна ведаць, як зменяцца ўмовы крэдытавання, калі ён унясе ў будаўніцтва пэўны аб'ём уласных грошай. Чалавеку стане вядомы менавіта яго персаніфікаваны рух фінансавых рэсурсаў. Вынік атрымаецца прыкладна такі ж, як і пры сённяшнім ільготным крэдытаванні (аб'ём крэдыту і працэнты па ім), а схема паступлення і руху грошай — іншая.

Навошта нам такая схема? Гэта ў першую чаргу звязана з тым, што міжнародныя фінансавыя арганізацыі патрабуюць ад нашай краіны адмаўляцца ад дырэктыўнага крэдытавання. Гэта датычыцца не толькі жыллёвага будаўніцтва, але і патокаў сродкаў, якія накіроўваюцца на розныя праекты. Напрыклад, мэтавага льготнага фінансавання арганізацый сельскай гаспадаркі, прадпрыемстваў прамысловасці, арганізацый культуры, транспарту і г. д.

Згодна з новай схемай праз пэўны час усе банкі пачнуць функцыянаваць у аднолькавых умовах і стануць прапаноўваць кліентам толькі крэдыты на рынкавых умовах з выкарыстаннем уласных сродкаў. А вось дзяржава праз пэўны механізм адраснай падтрымкі будзе дапамагаць гасіць гэты крэдыт непасрэдна Іванову ці Сідараву. У гэтым выпадку чалавек атрымае выбар: у які банк яму лепш звяртацца па крэдыт. А пойдзе чалавек хутчэй у тую фінансавую ўстанову, якая прапануе яму больш спрыяльныя ўмовы па крэдыце і яго абслугоўванні (на які тэрмін, пад які працэнт, колькі паручыцеляў, якія даведкі і іншыя нюансы). Тут усё залежыць ад канкрэтнай палітыкі камерцыйных банкаў, бо кліент будзе звяртаць увагу не толькі на памер і імідж установы, але і на іншыя яе характарыстыкі. Менавіта такія рынкавыя ўмовы паспрыяюць павышэнню канкурэнцыі ў банкаўскай сферы, упэўнены міжнародныя спецыялісты.

У новай схеме выдачы крэдытаў прадугледжваецца іншая крыніца фінансавання. Гэта будуць ужо не бюджэтныя сродкі, а грошы камерцыйных банкаў, іх зваротныя рэсурсы. А дзяржаўная дапамога (льгота) будзе давацца непасрэдна чаргавіку, а не пэўнаму сістэмнаму банку. Менавіта дзяржаўныя грошы будуць дапамагаць сем'ям кампенсаваць (цалкам ці часткова) працэнты і асноўны доўг па атрыманых крэдытах.

— А яшчэ ўсіх чаргавікоў турбуе будучы кошт будаўніцтва. Як моцна могуць змяніцца цэны?

— Магу адзначыць, што на працягу мінулага года ў будаўніцтве назіралася павышэнне эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў. І гэта не проста словы, бо цэны на будаўніцтва сур'ёзна стрымліваліся. Прааналізуем сітуацыю на прыкладзе цаны квадратнага метра. Калі ў пачатку мінулага года мы мелі цану «квадрата» больш за 800 рублёў, то сярэдняя цана квадратнага метра па годзе атрымалася 765 рублёў. Гэта для тых, хто будаваў з дзяржпадтрымкай. Заўважу, што ўрадам міністэрству была пастаўлена задача — не выйсці за мяжу ў 840 рублёў за метр. У нас атрымалася танней, таму і на 2017 год запланавалі невялікую дынаміку росту цаны на жыллёвы «квадрат». Цяпер мы лічым, што рост цаны квадратнага метра магчымы толькі ў сувязі з павелічэннем індэкса будаўніча-мантажных работ (БМР), які запланаваны на 2017 год у памеры 110,1%.

— Атрымліваецца, што сёлета жыллё для чаргавікоў падаражэе прыкладна на 10 %?

— Не зусім так. 10% — гэта максімальная мяжа росту, а на справе фактычнае павелічэнне індэкса БМР заўсёды было ніжэй планавага паказчыка.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

Больш падрабязна на www.zviazda.by.

НА СУВЯЗІ КОЖНУЮ СУБОТУ

Ва ўсіх рэгіёнах краіны працягваюць работу прамыя тэлефонныя лініі

Разбірацца ў камунальных, жыллёвых, дарожных і іншых набалелых пытаннях 25 лютага будуць прадстаўнікі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі спраў. Патэлефанаваць чыноўнікам можна з 9 раніцы да 12 гадзін. Нагадаем, «гарачыя» лініі працуюць кожную суботу.

Брэсцкі аблвыканкам
намеснік старшыні ВЯЛІЧКА Алег Іванавіч (80162213121);
Віцебскі аблвыканкам
кіраўнік спраў СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);
Гомельскі аблвыканкам
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);
Гродзенскі аблвыканкам
кіраўнік спраў ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);
Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні КУНЦЭВІЧ Андрэй Міхайлавіч (80222501869);
Мінскі аблвыканкам
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);
Мінскі гарвыканкам
кіраўнік спраў МАЦЕЛЬСКАЯ Ганна Мар'янаўна (80172224444).

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЗША ўведзены больш жорсткія правілы па дэпартацыі незаконных мігрантаў

Такім чынам улады краіны спадзяюцца павялічыць колькасць дэпартаваных парушальнікаў. У першую чаргу новыя меры датычацца нелегальных мігрантаў, якія былі асуджаны за здзяйсненне злачынстваў або ўяўляюць пагрозу для бяспекі ў краіне, а таксама на тых, хто нядаўна трапіў на тэрыторыю Злучаных Штатаў. У дакуменце, апублікаваным міністэрствам нацыянальнай бяспекі ЗША, прыведзены шырокі спіс катэгорый мігрантаў, якія падлягаюць дэпартацыі.

Імпарт і экспарт узбраенняў у свеце дасягнулі самых высокіх паказчыкаў з часоў «халоднай вайны»

Такія звесткі прыводзіць у сваім штогадовым дакладзе Стакгольмскі інстытут даследавання праблем міру (SIPRI), які займаецца пытаннямі разбраення і кантролю над узбраеннем. SIPRI лічыць, што актывізацыя гандлю зброяй абумоўлена ўзрослым попытам на Блізкім Усходзе і ў Азіі.

13% усяго сусветнага імпарту ўзбраенняў прыпадае на долю Індыі. Пры гэтым 70% зброі гэтая краіна імпартуе з Расіі. Іншыя буйныя партнёры індыйцаў — ЗША (12%) і Ізраіль (7%). Кітай, хоць і застаецца адным з найбуйнейшых імпарцёраў, апошнім часам скараціў аб'ёмы ўвазнога арсенала, паступова замяшчаючы яго прадукцыяй уласнай абароннай прамысловасці.

У Маскве рыхтуюцца да масавага зносу «хрушчовак»

Мэр Масквы Сяргей Сабянін даручыў падрыхтаваць стартавыя пляцоўкі для будаўніцтва шматкватэрных дамоў у рамках новай праграмы зносу старых пяціпавярховак. Пра гэта мэр паведаміў у сваім мікраблогу ў сетцы Twitter. Раней прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін даручыў Сяргею Сабяніну знесці ўсе так званыя хрушчоўкі ў Маскве, і на іх месцы пабудаваць новыя дамы. Сабянін адзначыў, што сталіца мае неабходныя фінансавыя магчымасці для рэалізацыі гэтага праекта. Паводле папярэдніх ацэнак, гаворка ідзе аб зносе 25 млн кв. метраў жылля або 7,5 тыс. дамоў, у якіх жывуць каля 1,6 млн чалавек.

У Паўднёвай Карэі да 2030 года працягласць жыцця жанчын перавысіць 90 гадоў

Аб гэтым сведчыць даследаванне навукоўцаў з Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і Імперскага каледжа ў Лондане, апублікаванае ў медыцынскім часопісе Lancet. У Японіі, Францыі, Іспаніі і Швейцарыі сярэдняя працягласць жыцця жанчын дасягне 88 гадоў. Мужчыны будуць даўжэй за ўсё жыць у Паўднёвай Карэі, Аўстраліі і Швейцарыі. Згодна з прагнозам навукоўцаў, сярэдняя чаканая працягласць жыцця тут складзе 84 гады. Адзін з аўтараў даследавання Маджыд Эззаці спрагназаваў, што з часам сярэдняя працягласць жыцця можа дасягнуць 110—120 гадоў.

■ Працоўны семестр

Зарабіць і пасябраваць — у студатрадзе

БРСМ даў старт праекту «Выбіраем студатрад!», падчас якога штабы працоўных спраў саюза моладзі ва ўстановах адукацыі краіны дапамогуць хлопцам і дзяўчатам знайсці работу на лета.

— Сёлета я ўпершыню запісваюся ў студатрад, — дзеліцца **першакурснік спецыяльнасці «Сістэмы радыёсувязі, радыёвяшчання і тэлебачання» Валерый ШКВАРКО** ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі. — Не хочацца бессэнсоўна праводзіць час летам, і запіс у працоўнай кніжцы не будзе лішнім. Ды і грошы не на апошнім месцы, хочацца нарэшце нешта набыць за свае «кроўныя». Запоўніў анкету на аператара-паштальёна ў Белпошце. Хутчэй за ўсё, буду працаваць у аддзяленні: прымаць пасылкі ў кліентаў, вырашаць пытанні па тэлефоне. Гэта мой профіль, таму магчымасць бліжэй пазнаць прафесію — яшчэ адна перавага. Акрамя гэтага, спадзяюся завесці цікавыя знаёмствы, бо студатрад — гэта не толькі работа.

Паводле слоў **сакратара пярвічнай арганізацыі БРСМ акадэміі сувязі Алены РУМЯНЦАВАЙ,** у гэтай установе адукацыі студэнтаў традыцыйна накіроўваюць на профільныя прадпрыемствы: «Белтэлекам», Белпошту, «Белсувязьбуд» і іншыя. Найбольш распаўсюджаныя вакансіі — падсобны рабочы, паштальён, кур'ер, аператар сувязі. Акрамя таго, многія ўладкоўваюцца на работу ў прыёмную камісію акадэміі. Летась установа адукацыі дапамагла працаўладкавацца 250 студэнтам, па прагнозах сёлета лічба не будзе меншай.

— Для мяне галоўны матыў пайсці летам працаваць — гэта грошы, — прызнаецца **першакурсніца факультэта электрасувязі Кацярына КАЖАМЯКА.** — Трэба плаціць за інтэрнат, набыць рэчы на наступны навучальны год, ды і на адпачынак грошы трэба. Уладкавалася ў прыёмную камісію, працаваць буду з сярэдзіны ліпеня да пачатку жніўня. Абяцаюць заробак ад 200 рублёў, мяне гэта задавальняе.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Дэкрэт №3

УМОВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДНОЛЬКАВЫЯ

Сяргей Раўнейка прапануе зрабіць папраўкі ў заканадаўстве для ваеннаслужачых тэрміновай службы і студэнтаў-платнікаў

Гэтую думку памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Гродзенскай вобласці выказаў у Ваўкавыску падчас прыёму грамадзян па пытаннях рэалізацыі Дэкрэта №3 «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрыманства».

Фота БЕЛТА.

Усяго на прыём прыйшлі 20 жыхароў Ваўкавыска і Ваўкавыскага раёна. Большасць з іх — гэта грамадзяне, якія трапілі ў спісы так званых утрыманцаў. Кожны — са сваёй гісторыяй. Кожны разлічвае на разуменне з боку ўладаў.

Ала Іванаўна не можа пагадзіцца з тым, што ў гэтыя спісы трапіў яе малодшы сын, які цяпер служыць у арміі. Да гэтага ён атрымаў дзве адукацыі, у тым ліку па спецыяльнасці заатэхнік. Але ўладкавацца на работу не змог. У выніку павінен заплаціць збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў. Але Іванаўне паабяцалі паспрыяць вызваленню яе сына ад неабходнасці выплачваць гэтыя грошы, а самому маладому чалавеку параілі пасля заканчэння службы звярнуцца ў райвыканкам для далейшага працаўладкавання.

— Нам патрэбны кадры, тым больш спецыялісты ў галіне сельскай гаспадаркі, — зазначыў Сяргей Раўнейка, — мы імі раскідвацца не будзем. Разам з тым павінны быць рэгламентаваны ўсе выпадкі, каб было менш прэтэнзій, і мы гэты вопыт напрацоўваем. Пазней з'явяцца розныя акты, палажэнні, але і зараз у грамадзян ёсць права падаць апеляцыю, згодна са змяненнямі, якія ўнесены ў Дэкрэт №3.

Арцём па адукацыі юрыст, але за папярэдні перыяд працаваў на некалькі дзён менш, чым устаноўлена Дэкрэтам, — да 183 дзён не хапіла ўсяго двух. Патлумачыў, што цяжка знайсці работу па спецыяльнасці. Зараз ён уладкаваўся юрысконсультам у райбальніцу. З аналагічнай праблемай звярнулася і эканаміст Хрысціна, якая зараз працуе на адным з буйных прадпрыемстваў Ваўкавыска. Падчас прыёму Арцёму і Хрысціне было прапанавана напісаць заяву з просьбай аб вызваленні ад выплаты збору. Разам з тым Сяргей Раўнейка адзначыў, што на рынку працы зашмат юрыстаў і эканамістаў, цяпер больш патрэбны тэхнічныя спецыяльнасці. Гэта варта ўлічваць пры выбары будучай прафесіі, каб не было праблем з працаўладкаваннем. У гэтым кірунку патрэбна змяніць і адукацыйныя праграмы.

Некалькі жыхароў раёна і райцэнтра, якія прыйшлі на прыём, патлумачылі сваю сітуацыю станам здароўя. У іх ліку і Людміла Іосіфаўна, якая пражывае ў Свіслачы, але набыла дом у Ваўкавыску. Цяпер жанчына ўладкавалася качагарам, разам з мужам трымаюць гаспадарку. На стан здароўя паскардзіўся і малады жыхар Ваўкавыска, які прыйшоў на прыём разам з маці. Ён паведаміў, што некаторы час працаваў на СТА ў Мінску, але звольніўся з-за хваробы і больш за два гады нідзе не працуе. За гэты час хлопец нават на ўлік у службу занятасці не стаў, да таго ж не атрымаў ніякай спецыяльнасці.

— Плаціць падаткі трэба, інакш мы не зможам утрымліваць нашу сацыяльную сферу, у тым ліку ахову здароўя, якой вы таксама карысталіся, — адказаў гэтым людзям Сяргей Раўнейка. — Думаю, што цяжкасцям можна супрацьпаставіць сваю сілу волі, а з боку дзяржавы будзе падтрымка, каб жыццё палепшылася.

Падчас прыёму спецыялісты райвыканкама ўдакладнілі, што ў цэнтры занятасці ёсць магчымасць набыць спецыяльнасці, якія патрэбны на рынку працы, гэта сталяр, станочнік, цясляр, для жанчын — кухар, кулінар, швачка. На гэтыя прафесіі есць попыт, ёсць гарантыі ад наймальнікаў. Да таго ж новыя рабочыя месцы з'явяцца на прадпрыемствах, якія зараз будуюцца.

Разам з тым у ходзе прыёму грамадзян узніклі пытанні, якія патрабуюць удасканальвання заканадаўства. У прыватнасці, склаліся неаднолькавыя ўмовы для маладых спецыялістаў, якія скончылі вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Так, дыпломы студэнтам-платнікам выдаюцца 30 чэрвеня, і калі спецыяліст не паспеў уладкавацца на работу з 1 ліпеня 2015 года па 1 студзеня 2016 года, то ўжо падпадае пад дзеянне Дэкрэта №3. У той жа час выпускнікоў бюджэтнай формы навучання гэта не закранае, бо іх працоўны адлік пачынаецца з 1 жніўня.

— Права на першае працоўнае месца ў нас гарантавана выпускнікам абедзвюх формаў навучання — і бюджэтнай, і платнай, — падкрэсліў Сяргей Раўнейка. — А канікулярны водпуск — гэта працяг вучобы, і павінен быць аднолькавы для ўсіх. У гэтай справе павінны быць змяненні.

Неабароненымі аказаліся і ваеннаслужачыя тэрміновай службы. Закон не замацоўвае за імі права вярнуцца на тое месца работы, адкуль яны пайшлі ў армію. З такімі выпадкамі не аднойчы сутыкалася раённае аб'яднанне прафсаюзаў, паведаміў яго старшыня Віктар Паўловіч. У той жа час за жанчынамі, якія знаходзяцца ў дэкрэтным адпачынку, іх працоўнае месца застаецца. Але абедзве сітуацыі падобныя, бо і дэкрэт, і армія не залічваюцца ў працоўны стаж. Старшыня раённага прафсаюза лічыць, што гэта — адыход ад сацыяльных гарантый.

Сяргей Раўнейка паведаміў, што такія пытанні абмяркоўваюцца, ужо падрыхтаваны адпаведныя змяненні. Кожнаму, хто прыйшоў на прыём, была дадзена парада звярнуцца з заявай у райвыканкам, дзе будуць улічвацца жыццёвыя абставіны: мясцовым органам улады цяпер нададзена права вызваляць ад выплаты збору на фінансаванне дзяржаўных расходаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

■

Дык ці была платная працэдура?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Са Смалявіч патэлефанаваў заяўнік Віктар Н. з пытаннямі, якія датычылі медыцынскага абслугоўвання.

— Нядаўна хацеў здаць кроў з вены на біяхімію ў паліклініцы, дык сказалі, што бясплатна гэта можна зрабіць толькі адзін раз на год. А паколькі я апошні раз здаваў кроў летась у красавіку, адпаведна, год яшчэ не прайшоў. Выходзіць, мне трэба рабіць працэдуру платна? Але раней, яшчэ зусім нядаўна, усе біяхімічныя аналізы былі бясплатнымі. Што за новаўвядзенне? Ці маюць яны на гэта права? — сфармуляваў грамадзянін свае пытанні.

Даць больш падрабязныя тлумачэнні наконт сітуацыі, што быццам бы ўзнікла ў заяўніка ў паліклініцы, ён адмовіўся. Гэтак жа, як і расказаць больш грунтоўна пра сябе. У такіх выпадках немагчыма даць дакладны адказ на агульнае пытанне, не ведаючы ўсіх акалічнасцяў справы.

Гэта нам пацвердзіла і **галоўны ўрач Смалявіцкай цэнтральнай раённай бальніцы Святлана ДУБОЎСКАЯ,** якую мы папрасілі коратка пракаментаваць зварот заяўніка.

— Кожную сітуацыю трэба разглядаць індывідуальна. Так, рашэнне аб правядзенні аналізаў на платнай аснове можа быць прынята лечачым урачом — у інтарэсах чалавека. Але трэба ведаць, якое менавіта захворванне ў пацыента, як яно працякае, да таго ж, ці згодны сам кліент на платную працэдуру, — сказала Святлана Віктараўна. — Разам з тым, калі па клінічных паказчыках яна пацыенту патрэбная — будзе праведзена бясплатна.

Галоўны ўрач бальніцы была здзіўлена, што грамадзянін адрасаваў сваё пытанне найперш у газету. «Трэба было адразу звяртацца да адміністрацыі, можна было канкрэтна да мяне».

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

СВЯДОМЫ ТАТА ПАЛЯПШАЕ ЗДАРОЎЕ МАМЫ

Сетка «тата-школ» выходзіць за межы Мінска: чакаюцца заняткі ў Барысаве, актыўна прапагандаваць ідэі бацькоўства валанцёрам гатовыя ўрачы і псіхолагі ў Брэсце і Гродне. Гэта сведчанне таго, што шведска-беларускі праект, які рэалізуецца дабрачынным аб'яднаннем «Клуб ільвоў» сумесна з Мінскім гарадскім цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей і іншымі дзяржаўнымі структурамі, рухаецца ў правільным кірунку.

— «Тата-чат», створаны як дадатковы сродак для запрашэння мужчын на заняткі ў «тата-школы», пераўтварыўся ўжо ў амаль самастойны рэсурс для інтэрнэт-размоў на тэмы, якія хвалююць бацькоў. Ён налічвае ўжо больш за 200 удзельнікаў. Асобна плануецца рэалізоўваць праекты, якія ўвядуць татаў у тэмы адносін з падлеткамі, а таксама і дзецьмі, якія ўжываюць наркотыкі, — расказалі **Вячаслаў ШЧЭРБА і Раман КРУЧКОЎ, прадстаўнікі шведска-беларускага праекта з боку Беларусі.**

Каб яшчэ больш заахвоціць мужчын задумацца пра сваё бацькоўства, на вуліцах павінны з'явіцца білборды, з якіх да татаў будуць звяртацца дзеці розных узростаў. Асноўная іх ідэя — «Што тваё дзіця будзе памятаць пра цябе». Акрамя таго, слухачы школы мараць зрабіць Дзень таты, што адзначаецца ў чэрвені, дзяржаўным святам.

— Хоць заняткі ў «тата-школах» і скіраваны на бацькаў, яны паляпшаюць здароўе жанчын, бо тыя адчуваюць сябе спакайнейшымі, ведаючы пра надзейны тыл, і менш стамляюцца ад работы, калі частку яе бярэ на сябе мужчына, — адзначыў **Матс БЕРГГРЭН, кіраўнік шведска-беларускага праекта з боку Швецыі.** — Усё разам гэта працуе на дасягненне галоўнага выніку — выхаванне шчаслівага дзіцяці.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

МУЖЧЫН ПРЫБАВІЛАСЯ

За год іх у Беларусі стала больш на 6 тысяч

Па звестках Белстата, на пачатак гэтага года мужчын налічвалася 4 мільёны 427 тысяч. Хоць у агульнай колькасці насельніцтва іх удзельная вага застаецца нязменнай — 46,6 працэнта.

Большасць мужчын (75 працэнтаў) — гараджане. Кожны пяты — мінчанін. Сярэдні ўзрост беларускіх мужчын складае 37 гадоў. Прычым сярэднестатыстычны вясковец старэйшы за гараджаніна. 65 працэнтаў знаходзяцца ў працаздольным узросце, 16 працэнтаў — пенсіянеры. Сярод занятых у эканоміцы Беларусі мужчын — 49,3 працэнта. Традыцыйна мужчынскімі відамі дзейнасці застаюцца прамысловасць, будаўніцтва і транспарт. Летась 64,5 тысячы прадстаўнікоў моцнай паловы нашай краіны ўступілі ў шлюб, з іх 46,1 тысячы чалавек ажаніліся ўпершыню. Сем'і беларускія мужчыны ствараюць пераважна ў 20—29 гадоў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

РЭВАЛЬВЕР, ЗРОБЛЕНЫ Ў 1917 ГОДЗЕ,

знайшоў 38-гадовы гамяльчанін, калі рабіў рамонт у хаце, дзе раней пражываў яго дзед.

Мужчына прыйшоў у аператыўна-дзяжурную службу Добрушскага РАУС і прынёс зброю з просьбай знішчыць. Як расказаў **афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый ПІЛЬКЕВІЧ,** здзіўленню супрацоўнікаў дзяжурнай часткі не было мяжы, калі яны пабачылі «Наган» калібра 7,62 мм. Рарытэт, дарэчы, мае нумар — 988 і надпіс: «ТУЛЬСКИЙ ИМПЕР. ПЕТРА ВЕЛИК ОРУЖ. ЗАВОД 1917». Такім чынам, знойдзены рэвальвер выявіўся аднагодкам беларускай міліцыі. Праваахоўнікі кажуць, што зброя захавалася вельмі добра і цалкам спраўная. Цяпер па рэвальверы прызначана балістычная экспертыза. Між тым ва УУС нагадваюць, што грамадзяне, якія добраахвотна здалі зброю, боепрыпасы і выбуховыя рэчывы, вызваляюцца ад крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

ШКАРПЭТКІ Ў БЛЯШАНЦЫ

Брэсцкі панчошны камбінат зрабіў такі падарунак-жарт да Дня абаронцаў Айчыны.

Чарговую партыю мужчынскіх шкарпэтак закаталі ў кансервавыя бляшанкі. Маўляў, можна ўзяць з сабой на пікнік, і заўсёды будзе ў запасе пара сухіх шкарпэтак. Калі інфармацыя з'явілася ў сеціве, я, шчыра кажучы, не паверыла, падумала, розыгрыш. Патэлефанавала ў фірмавую краму прадпрыемства, якая знаходзіцца побач з камбінатам.

Там сказалі: праўда. Але тавару ў продажы няма, яго раскупілі за адзін дзень, было выпушчана толькі тры тысячы бляшанак. Што ж, як кажуць, з пачынам! Да жаночага дня будзем чакаць бікіні ў слоіках. Яшчэ больш забаўна.

ЛЁД СТАЎ НЕБЯСПЕЧНЫМ

Брэсцкі абласны савет таварыства выратавання на водах звярнуўся да насельніцтва з папярэджаннем аб небяспецы выхаду на лёд.

У апошнія дні тэмпература паветра ў рэгіёне значна павысілася, часам слупок тэрмометра падымаецца да адзнакі плюс 10. У такой абстаноўцы лёд губляе трываласць, актыўна ўтвараюцца намывы і прамывіны. Таму нават знешне трывалае ледзяное покрыва можа таіць смяротную небяспеку. З пачатку гэтага года на вадзе загінула трое жыхароў рэгіёна, дваіх удалося выратаваць. Так, у Брэсце нецвярозы рыбак на Мухаўцы блізка падышоў да краю прамывіны і праваліўся ў ваду. Небараку выцягнулі з вады таварышы. Па-ранейшаму актуальнай застаецца праблема гібелі на вадзе людзей у стане алкагольнага ап'янення.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

Следства просіць звярыць нумары купюр

Следчы камітэт просіць грамадзян дапамагчы ў знаходжанні падробленых купюр наміналам 20 рублёў з серыйным нумарам СК 8387976 узору 2009 года, паведаміў афіцыйны прадстаўнік УСК па Мінску Аляксей КЛІМОВІЧ.

Фрунзенскі раённы аддзел Следчага камітэта распачаў крымінальную справу ў дачыненні да двух мужчын, якія падазраюцца ў вырабе і збыце падробленых беларускіх рублёў. Падставай паслужылі матэрыялы праверкі, праведзенай супрацоўнікамі УБЭЗ ГУУС Мінгарвыканкама. Падазраваныя затрыманы. Падчас папярэдняга расследавання следчымі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі частка падробленых грашовых знакаў канфіскавана. Следства мяркуе, што ў грамадзянскім абароце могуць яшчэ знаходзіцца падробленыя купюры наміналам 20 рублёў узору 2009 года з серыйным нумарам СК 8387976. У сувязі з гэтым следства звяртаецца да грамадзян з просьбай звярыць нумары грашовых знакаў, якія знаходзяцца ў карыстанні. У выпадку супадзення серыйнага нумара неабходна звярнуцца па тэлефонах: 8 (017) 252 02 02, 8 (017) 256 14 34.

Падазраваныя 1991 і 1989 гадоў нараджэння са студзеня па люты вырабілі з мэтай збыту каля 200 адзінак такіх грашовых знакаў. Падробленыя купюры збываліся ў арганізацыях гандлю, маршрутных таксі, кіёсках КУП «Мінсктранс» і іншых арганізацыях з мэтай размену, шляхам набыцця недарагіх тавараў.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

Зачараваныя небам

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Потым служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Тут, у Баброуйску, ажаніўся, двойчы стаў бацькам. Потым была Германія, а тады зноў Беларусь. У запас палкоўнік авіяцыі пайшоў ужо з пасады начальніка армейскай і транспартнай авіяцыі краіны. Сёння Аляксандр Паўлаў тэсціруе авіятрэнажоры, створаныя айчынным ВПК, — адным словам, той жа лётчык-выпрабавальнік.

— Раней трэнажораў не было, авіятары асвойвалі тэхніку непасрэдна падчас палётаў, — расказвае верталётчык. — А як падчас рэальнага палёту можна адпрацаваць асаблівыя выпадкі: напрыклад, адмова рухавіка або пажар на борце? Дзякуючы сучасным трэнажорам гэта магчыма. Цяперашняе пакаленне лётчыкаў і верталётчыкаў да аўтаматызму адпрацоўвае ўсе асаблівыя выпадкі, каб у рэальнай сітуацыі (вядома, лепш каб яе не было!) справіцца з усімі цяжкасцямі.

Фота Надзеі БУЖАН.

ЛЮБОЎ ДА АВІЯЦЫІ — У СПАДЧЫНУ

Тое, што сын пайшоў па бацькавым шляху, не дзіўна. Яўген Паўлаў з маленства хадзіў з бацькам на аэрадром, назіраў за тым, як ён лятае, — любоў да авіяцыі, без перабольшання, перадалася яму ў спадчыну. Паўплывала і асяроддзе, у якім рос: у ваенных гарадках, дзе жылі, лётчыкі і верталётчыкі былі на кожным кроку. Яшчэ школьнікам лятаў на верталётах. Вядома, у якасці пасажыра.

Як прызнаецца Яўген, падчас выбару прафесіі бацька ніколі не навязваў яму сваё меркаванне. «Спачатку я хацеў стаць кардыяхірургам, але да авіяцыі ў мяне любоў з дзяцінства, — расказвае верталётчык. — Я заўжды ганарыўся, што мой бацька — лётчык. Сёння падобныя словы чую ўжо ў свой адрас ад дачкі...»

Бацькавай радасці не было мяжы, калі сын паступіў на авіяцыйны факультэт Ваеннай акадэміі. А адзін раз, ужо праз некалькі гадоў пасля вучобы, старэйшаму Паўлаву нават удалося асабіста ацаніць узровень сынавай падрыхтоўкі.

«Неба ўсюды адно і тое ж, — перакананы Яўген Паўлаў. — Калі падымаешся ўвысь, застаешся сам-насам са стыхіяй».

— Я паляцеў з ім у якасці інструктара, — прыгадвае Аляксандр Паўлаў. — І быў задаволены палётам, а галоўнае, перакануся ў тым, што мой сын на сваім месцы. Ён вельмі любіць лятаць...

Здаецца, яму пашанцавала больш, чым бацьку. Яўген як прыйшоў у 50-ю змешаную авіябазу пасля Ваеннай акадэміі, так служыць тут ужо дванаццаты год. Але, як прызнаецца сам верталётчык, ён гатовы да ўсяго, бо да пераездаў прызвычаіўся з дзяцінства.

— Неба ўсюды адно і тое ж, — перакананы Яўген Паўлаў. — Калі падымаешся ўвысь, застаешся сам-насам са стыхіяй. Ёсць толькі ты і пяты акіян. Бывае, ляціш ноччу па маршруце, глядзіш, а сярод лесу адна хатка свеціцца. Думаеш, а хто там жыве, а які ў таго чалавека лёс. Вось тут людзі разам жывуць, а ён тут адзін... Калі ў мяне пэўныя сямейныя праблемы (напрыклад, захварэе дзіця) або непрыемнасці на службе, варта толькі ўзляцець і ты пра ўсё забываеш. Думаеш толькі пра палёт і пра выкананне пастаўленай задачы.

Да нядаўняга часу Яўген Паўлаў лятаў на верталёце Мі-8 старой мадыфікацыі. Цяпер ён сярод тых шчасліўчыкаў, хто сядзіць за штурвалам новых вінтакрылых машын, якія нядаўна папоўнілі авіяпарк 50-й базы. Як прызнаецца лётчык, перавучыцца было нескладана. «Па тэхніцы пілатавання дадзеная мадыфікацыя мала чым адрозніваецца ад папярэдняй, — лічыць камандзір верталётнага атрада (на Мі-8) верталётнай эскадрыллі (на Мі-24, Мі-8). — Але гэта ўжо ўдасканаленая тэхніка, машына XXI стагоддзя».

Як кажуць верталётчыкі, сапраўдны прафесіянал павінен лятаць у любое надвор'е. Цікава, што і бацька, і сын аддаюць перавагу пахмурнаму небу.

— Чым складаней, тым лепш. Лятаць у сонечнае надвор'е — лягчэй лёгкага, а вось у неспрыяльнае... — кажуць яны ў адзін голас.

— Ці часта звяртаецеся да бацькі па прафесійныя парады? — пытаюся ў Яўгена.

— Пастаянна. У яго багацейшы вопыт службы ў савецкай арміі. Мы многае ўзялі менавіта адтуль. Менавіта на той базе, на той старой школе мы пабудавалі нашы беларускія ваенна-паветраныя сілы. Наша авіяцыя займае дастойнае месца ва Узброеных Сілах, а некаторым дзяржавам нават ёсць чаму ў нас павучыцца!

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

МОРА Ў АГНІ

У той час як 67-ы Берлінскі кінафестываль, што завяршыўся 18 лютага, толькі-толькі падвёў вынікі і назваў пераможцам венгерскую карціну «Пра цела і душу» Ільдзіка Эньедзі, у абмежаваны мінскі пракат выходзіць уладальнік «Залатога мядзведзя» мінулага Берлінале.

Для дакументальнай карціны «Мора ў агні» Джанфранка Розі вылучана толькі тры паказы, якія адбудуцца 24, 26 і 27 лютага ў кінатэатры «Цэнтральны». Яна расказвае пра дні італьянскага вострава Лампедуза, праз які праходзяць тысячы мігрантаў у пошуках акна ў Еўропу.

...Рэжысёр прыехаў на Лампедузу, каб зняць дзесяціхвілінную кароткаметражку пра жыхароў вострава. Урач, да якога той звярнуўся з бранхітам, расказаў шмат цікавых рэчаў пра сваю практыку з мігрантамі — яны тысячамі, калі жывыя, то знясіленыя, прыбываюць на Лампедузу як на перавалачны пункт, каб далей адправіцца шукаць лепшага жыцця ў Еўропе. У выніку Джанфранка Розі застаўся тут на паўтара года і стварыў поўнаметражную карціну пра трагедыю сучаснасці. Фільм аказаўся не проста кан'юнктурным — бо тэма мігрантаў апошнім часам прыносіць творцам шмат перамог, — а адной з найважнейшых кінакарцін года, якую нельга прапускаць.

Эксклюзіўныя паказы пераможцы Берлінале пройдуць у рамках праекта «Лістапад. Калекцыя».

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

Даты Падзеі Людзі

23 ЛЮТАГА

1808 год — дата нараджэння Пятра Васілевіча Кірэеўскага, рускага фальклярыста, археографа. У 1830-я гады наведаў Беларусь, ад мясцовых збіральнікаў атрымаў больш за 800 тэкстаў беларускіх народных песень і прыпевак, у асноўным з Мінскай губерні. Беларускія матэрыялы (песні калядныя, валачобныя, купальскія, жніўныя, вясельныя, прыпеўкі да танцаў з ваколіц Слуцка, Мінска, Барысава, Івянца, Талачына і інш.) склалі «Беларускі архіў» Кірэеўскага. Памёр у 1856 годзе.

1826 год — Мікалай Іванавіч Лабачэўскі выступіў на пасяджэнні фізіка-матэматычнага факультэта Казанскага ўніверсітэта. Ён прадставіў даклад «Сціслы выклад пачаткаў геаметрыі са строгім доказам тэарэмы аб паралельных». Гэтым самым быў пакладзены пачатак неэўклідавай геаметрыі.

1878 год — нарадзіўся Казімір Севярынавіч Малевіч, беларускі і расійскі жывапісец-абстракцыяніст. Адзін з заснавальнікаў абстрактнага мастацтва, заснавальнік супрэматызму. У 1904—1905 гг. — вольны слухач Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства. У 1918-м выкладаў у Дзяржаўных вольных мастацкіх майстэрнях у Маскве і Петраградзе, у 1919—1922 гг. — у Народнай мастацкай школе «новага рэвалюцыйнага ўзору» ў Віцебску. Затым — дырэктар Ленінградскага інстытута мастацкай культуры. Аўтар славутага «Чорнага квадрата». Сярод карцін: «Жанчына з кветкай», «Квітнеюць яблыні» і іншыя. Заснавальнік арганізацыі «Сцвярджальнікі новага мастацтва» («Уновіс»). У 1920 годзе кіраваў мастацкім афармленнем свята 3-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Віцебску. Памёр у 1935 годзе.

1947 год — нарадзіўся Валерый Аляксандравіч Кучынскі, спявак, заслужаны артыст Беларусі. З 1967 года — саліст Ансамбля песні і танца БВА, у 1970—1973 і 1976—1979-х гадах — Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Сярод оперных партый: Максім («Зорка Венера» Ю. Семянякі), Анегін, Ялецкі («Яўген Анегін», «Пікавая дама» П. Чайкоўскага) і многія іншыя. У канцэртным рэпертуары — камерная лірыка, песні беларускіх кампазітараў. Лаўрэат усесаюзных і міжнародных конкурсаў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Памёр у 2016 годзе.

Было сказана

Уладзімір КАРЫЗНА, паэт:

«Якое ўсё ўмоўнае —
І радасць,
І журботлівы настрой...»

Уважаемые акционеры
ОАО «Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции»!
30 марта 2017 года в 14.00
состоится годовое общее собрание акционеров.

Место проведения собрания: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, административное здание Общества, 2-й этаж, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год и основных направлениях деятельности Общества на 2017 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2016 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о работе в 2016 году, рассмотрение результатов ежегодной ревизии – по результатам финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
Рассмотрение аудиторского заключения по итогам проведения ежегодного аудита Общества за 2016 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках и распределение прибыли и убытков Общества за 2016 год.
5. План распределения чистой прибыли Общества на 2017 год.
6. О размерах вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О внесении изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37, на 5-м этаже, в кабинете службы менеджмента качества с 10 по 29 марта 2017 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00), а в день проведения собрания – по месту проведения собрания.
Регистрация участников собрания – с 13.00 до 13.50.
При себе иметь: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.
Список акционеров будет сформирован по состоянию на 01.03.2017 года.
УНП 600122771 Наблюдательный совет

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
27 марта 2017 года торгов по продаже имущества,
на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)			
Наименование, местонахождение, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Балансодержатель (должник)	Начальная цена, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
Здание склада (склад заготовок блоко-цехов главного корпуса), инвентарный номер №500/С-31835, общей площадью 13137,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Красноармейская, д. 21	ИООО «Белбизнесальянс»	9 153 748,00	300 000,00

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.
Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 №63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.
К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Аукцион проводится 27 марта 2017 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 24.02.2017 по 23.03.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»).

ОТЧЕТ
УНП 490912965
Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития
«Эко-Инновация»
об использовании своего имущества за 2016 год

Количество учредителей Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» – 4, из них 3 – физические лица.
Информация о стоимости имущества Местного фонда поддержки предпринимательства и сельского развития «Эко-Инновация» (далее – Фонд):
– стоимость имущества, переданного учредителями при учреждении Фонда, составляет 2045 белорусских рублей 00 копеек в деноминированных единицах;
– поступления от мероприятий, проводимых в соответствии с уставом Фонда (целевое финансирование), составляют 37 057 белорусских рублей 96 копеек;
– поступления из иных источников, не запрещенных законодательством, – 2852 белорусских рублей 45 копеек.
Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе Фонда, составила 29 062 белорусских рублей 88 копеек.
Фонд не имеет филиалов.
Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях.
Директор Е. Ф. Молочко, бухгалтер Е. Я. Ходот.

Сямейная газета

Выпуск № 4 (71)

ПАПЯРОВЫЯ КРЫЛЫ

У горадзе Н. жылі тоўстыя людзі. Яны пастаянна штосьці елі: дома, па дарозе на працу, за рабочым сталом... Склалася такое адчуванне, што яны жывуць, каб есці, а не наадварот. Дзяўчынка, якая расла ў такой тоўстай сям'і, аднойчы ўбачыла праз акно птушку, што бесклапотна кружляла ў небе. І ёй таксама захацелася ўзляцець. Спачатку малая паспрабавала гэта зрабіць пры дапамозе паветраных шарыкаў. Але вяроўка не вытрымала яе вагі і парвалася. Шарыкі ўзняліся ў неба. Потым яна спрабавала ўзляцець пры дапамозе паветранага цмока, дэльтаплана, але паўтарылася тое ж самае... Дзяўчынка ў роспачы ляжала на зямлі... У гэты момант да дрэва падляцела птушка і адшчыкнула ад галінкі зімнюю ягаду. І зноў знікла ў небе. Дзяўчынка прыбегла дадому, набрала ў міску ажын ды суніц — і пачала рабіць крылы з кардона і газетнай паперы. Калі растаў снег, яны былі гатовыя. А лішніх кілаграмаў як не было. І яна ўзляцела...

Гэты ролік пра тоўсты горад дагэтуль круціцца ў мяне ў галаве, не адпускае. Часам я таксама, як тая дзяўчынка, адчуваю сябе непад'ёмнай. Толькі замест лішніх кілаграмаў мне не даюць адарвацца ад зямлі «рамкі». Некаторыя — навязаныя яшчэ з дзяцінства. Некаторыя — набытыя ў свядомым узросце.

Адна з іх — гэта «сіндром выдатніцы», перфекцыянізм. Трэба ўсё зрабіць ідэальна, не зважаючы на свой унутраны стан. Ніхто не вучыў прыслухоўвацца да сябе, свайго арганізма, унутранага голасу. Галоўнае, «кроў з носу» выканаць пастаўленую задачу — нават калі яе паставіла перад сабой ты сама. А пасля — што будзе, тое будзе. І я такая не адна.

Некалькі дзён таму ў сацыяльных сетках знаёмая выклала фотаздымак з бальнічнай ежай. «Вось быццам бы разумная дзяўчынка, — піша яна, — ведаю, што лепш вучыцца на чужых памылках. Што сябе трэба любіць. Што незаменных — няма. Што хворы ты не патрэбны нават самому сабе. І што калі цябе не стане, ужо праз месяц пра цябе забудуць. Усё ведаю, так. І ўсё роўна бягу. «Завалілася». Цяпер сама сабе абяцаю, што як толькі ачуняю, пачну новае — свядомае, спакойнае жыццё».

«Рамкі», якія не даюць адарвацца ад зямлі, у кожнага свае. Муж прыяцелькі, напрыклад, убіў сабе ў галаву, што дзецям патрэбныя выключна багатыя бацькі. Таму працуе не апускаючы рук, з ранку да позняга вечара. Бачыць дачку некалькі гадзін на суткі.

Іншы ўсе свае найлепшыя гады будаваў кватэру. Каб выплаціць крэдыты і даўгі, працаваў на некалькіх работах. Нікуды не ездзіў, нікуды не хадзіў — адным словам, свету белага не бачыў. Нядаўна сустрэліся ў метро, аказваецца, ён развёўся з жонкай. Цяпер здымае кватэру. І працягвае выплачваць крэдыт за двушку, у якой жыве былая жонка з малым сынам.

...Калі халасцяк памірае ва ўзросце дзевяноста гадоў, хтосьці запытаўся ў яго:

— Ты так і не ажаніўся, чаму?

— Не тое, каб я быў супраць шлюбу, проста шукаў ідэальную жанчыну. І так, у пошуках, праляцела ўсё маё жыццё.

— Але няўжо на ўсёй велізарнай планеце, населенай мільёнамі людзей, ты не змог адшукаць адну-адзіную ідэальную жанчыну?

— (Сляза скацілася па шчацэ старога.) Не, адну я ўсё ж такі знайшоў.

— Тады што ж адбылося, чаму вы не пажаніліся?

— Тая жанчына таксама шукала ідэальнага мужчыну...

Рамка — «ганарлівасць», рамка — «прага да славы і выгады», рамка — «а што людзі падумаюць», рамка — «так трэба» (а каму?), рамка — «эгаізм»... Гэтыя рамкі-пачуцці не даюць адчуць лёгкасць, адарвацца ад зямлі.

...Мама (як кажуць яблык ад яблыні) учора ўпершыню ў жыцці спаліла грэчку. Расстроілася. Тэлефануе: «Са мной раней ніколі такога не было!» — «Боже, какой пустяк, сделать хоть раз что-нибудь не так», — адказала я ёй словамі з песні. І пераслала той самы ролік пра тоўсты горад... Да вясны засталося менш як 140 гадзін. За гэты час цалкам можна паспець змайстраваць сабе крылы...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

nadzieja@zviazda.by

■ Прэм'ера рубрыкі «Бацькоўскі клуб»

Першае правіла Бацькоўскага клуба — не казаць пра Бацькоўскі клуб. Другое правіла Бацькоўскага клуба — нідзе не казаць пра Бацькоўскі клуб. Трэцяе правіла Бацькоўскага клуба — не звяртаць увагі на першыя два правілы... «Бацькоўскі клуб» — новая рубрыка, у якой разважаюць, спрачаюцца і дыскутуюць таты розных пакаленняў нашай рэдакцыі. Вітайце: загартаваны 20 гадамі сямейнага жыцця Сяргей КУРКАЧ і яго маладзейшы калега Валянцін БОЙКА. Без пустаслоўя і сюсюкання — толькі суровы мужчынскі погляд на рэчы. Мінімум эмоцый — максімум аргументаў. Пакуль не пераможа чыйсьці пункт гледжання.

ШУКАЙЦЕ, ПАНЕНКІ, У ПЫЛЕ «БРЫЛЬЯНТЫ»

Гэты цудоўны кадр адкрываў выстаўку фотаздымкаў «Місія таты», якую ладзіў Фонд ААН у галіне народанасельніцтва ў Беларусі. (Фота журналісцкага агенцтва «Таранціны і сыны»).

Сёння мы прапаноўваем вам свой погляд на крытэрыі «мужчынскасці»

«Мужчыны з Марса, а жанчыны з Венеры». Так называецца вядомая кніга амерыканскага псіхолага. І нездарма: мы настолькі розныя, што версія аб паходжанні мужчын і жанчын з розных планет не выглядае перабольшаннем. Аднак нас усё роўна цягне адно да аднаго. Прычым на стадыі закаханасці мы цэнім у партнёрах адныя рысы, а ў сямейным жыцці — іншыя. Хто такі сапраўдны мужчына? Суровы «альфа-самец», што цэлымі днямі «косіць» грошы? Або сем'янін, які варыць дзецям кашу і мяняе пялюшкі? Заўзяты прагматык або рамантычны летуценнік?

(Заканчэнне на 6-й стар. «СГ».)

■ Настальгія

Казачкі з антрэсоляў

Аднойчы мама ў дэкрэце і рэжысёр па адукацыі Наталля ЛЕВАНАВА знайшла ў бацькоўскім доме праектар са стужкамі. І проста не змагла пакласці гэты скарб назад на антрэсолю. Сёння разам з сябрамі-аднадумцамі — прафесійнымі музыкамі і акцёрамі — яна агучвае дыяфільмы свайго дзяцінства і тым самым дорыць ім другое жыццё.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Наталля ЛЕВАНАВА і Андрэй ЕЎДАКІМАЎ лічаць праектар і дыяфільмы светлым промнем свайго савецкага дзяцінства.

Выключаецца святло — і на экране з'яўляецца знаёмы з дзяцінства надпіс «Студыя «Дыяфільм». «...А зараз мы вам пакажам і раскажам смешную, кранальную і павучальную казачку, — таямнічым голасам інтрыгуе Наталля дзетак і іх бацькоў. — Называецца яна «Слон Хортан выседжвае яйка». Яна была напісана дзякуючы... парыву ветру. Як? А так! Жыў у Амерыцы чалавек. Яму вельмі падабалася маляваць катоў, птушак, чарапах... Аднойчы ў пакоі, дзе ён працаваў, адчынілася акно. Вецер закружыў паперкі, што ляжалі на стале. Маленькі малюначак слана апынуўся на падлозе над вялікім малюнкам дрэва. Чалавек засмяяўся і напісаў казку пра слана, які залез на дрэва. Імя гэтага чалавека Тэадор Сьюз Гайзель. Аднак пад казкай ён падпісаўся іншым, выдуманым, імем — Доктар Сьюз, а слана назваў Хортанам, у гонар свайго аднакласніка...»

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

НА ШЛЯХУ ПРЫНЯЦЦЯ «СОНЕЧНЫХ ДЗЕТАК»

Бацькі 3-гадовай дзяўчынкі з сіндромам Даўна — пра цяжкасці і стэрэатыпы ў грамадстве

«Навошта вам такое дзіця?», «Якая ў яго будучыня?», — такімі рэмаркамі суправаджаецца жыццё бацькоў, якія вырашаюць пакінуць немаўля з інваліднасцю. Сіндром Даўна дае яшчэ больш падстаў для спрэчак і абмеркаванняў. Бо акрамя фізічных асаблівасцяў, у «сонечных дзетак» нямала знешніх заган. Плоскі тварык і патыліца, кароткія ручкі і ножкі, прыадкрыты роцік — толькі самыя прыкметныя з іх. Гэтыя рысы змазваюць ідэальны малюнак шчаслівай сям'і. Але ці ў малюнку шчасце? Карэспандэнт «Звязды» завітала ў госці да шматдзетных бацькоў, якія выхоўваюць «сонечную» дзяўчынку, і даведалася пра спосабы барацьбы са стэрэатыпамі ў грамадстве.

Калі гаспадыня адчыніла дзверы, жвавае малое падляцела да мяне і абхапіла за ногі. «Не пужайцеся, гэта яна так знаёміцца», — папярэджвае маці дзяўчынкі. Агата — трэцяе дзіця ў 33-гадовай Настассі і 35-гадовага Сяргея Сухоцкіх, якія ў шлюбе ўжо 10 гадоў. Дзяўчынка з'явілася на свет тры гады таму. Дыягназ паставілі на першым УГД. Маладая сям'я зрабіла выбар у бок жыцця.

Пазнаёміліся Сяргей і Настасся ў касцёле. Яны разам спявалі ў хоры. Да шлюбу маладыя людзі сустракаліся каля двух гадоў. Першы час яны жылі ў сталіцы, а потым прыйшлі да думкі, што з дзеткамі зручней за горадам у прыватным доме. Цяпер маладая сям'я здымае кватэру і адначасова займаецца будоўляй уласнага дома каля Ракава, што за 25 кіламетраў ад Мінска. Сяргей па спецыяльнасці радыёінжынер, працуе ў галіне будаўніцтва. Настасся па прафесіі перакладчык-філолаг, валодае англійскай, італьянскай, шведскай, польскай мовамі. Цяпер жанчына ў дэкрэтным водпуску.

Старэйшаму Стэфану дзевяць гадоў, сярэдняму Давіду — пяць. Пакуль Агата малодшая ў сям'і, але ў красавіку чакаецца папаўненне. «Мы ніколі не ставілі канкрэтных лічбаў наконт дзетак, — усміхаецца Настасся. — Меркавалася, што ўсё будзе адбывацца з прамежкамі, каб паспяваць вырашаць побытавыя моманты. Але дзетак заўсёды хацелася».

— Да Агаты я не да канца разумела сэнс УГД, якое робіцца да дванаццатага тыдня цяжарнасці, — прызнаецца маці. — Для мяне гэта была, хутчэй, забаўка: пабачыць маленькага, памахаць ручкай. Вядома, вынік УГД прывёў мяне ў шок. Гаварылі, што асноўны паказчык — шыйная складка — такіх памераў, што спадзявацца на лепшае нельга. Далей нас накіравалі да акушэраў-генетыкаў для дадатковых даследаванняў, якія на 98 працэнтаў далі б дакладны адказ, ці ёсць у дзіцяці генетычныя парушэнні і якія. Але мы адмовіліся, бо гэта абсалютна не змяніла б нашае рашэнне нараджаць. Шлях прыняцця быў няпросты. Заўсёды заставаўся шанц, надзея на лепшае...

Першы дзень нараджэння «сонечнай» Агаты.

У няпростай жыццёвай сітуацыі не абысціся без падтрымкі блізкага чалавека. Для Настассі, безумоўна, такой падтрымкай стала меркаванне мужа: «Мы прымем гэтае дзіця ў любым выглядзе, якім яно народзіцца. З парокам — значыць з парокам. З сіндромам — значыць з сіндромам».

Так, акрамя сіндрома Даўна, Агаце паставілі парок сэрца. Урачы казалі: імавернасць, што дзіця дажыве да родаў, невялікая, але калі і народзіцца жывое, то доўга не вытрывае. У маладых бацькоў пыталіся: — «Навошта вам гэта? У вас жа ёсць ужо двое». Нават блізкія людзі раілі: не стаўце на сабе крыж, зрабіце, як усе, і працягнецца нармальнае жыццё.

— Мы ўпэўненыя, кожнае дзіця — гэта бясцэнны дар, а такое дзіця — асабліва, — тлумачыць Настасся. — Калі ў сям'і нараджаецца асаблівае дзіця — гэта ўзбагачае душу не толькі бацькоў, але і ўсёй сям'і, родных. Я заўсёды лічыла, калі малое пражыве нават некалькі гадзін пасля нараджэння, — значыць гэта для чагосьці патрэбна.

Грамадская думка наклала свае адбіткі на свядомасць бацькоў. Яшчэ да родаў Настасся баялася, што будзе саромецца дачкі. «Я не ведала, як з ёй пайду на вуліцу, баялася касых позіркаў, — прызнаецца матуля. — Лічыла, калі ёсць шанц, што памыліліся ў дыягназе, то хай лепш пацвердзіцца парок, а сіндром акажацца памылковым. Пасля родаў Агата была ў рэанімацыі. На другі дзень я зазірнула да яе, і ўсе гэтыя глупствы зніклі самі сабою. У мяне была яскравая ўстаноўка — усімі сіламі мы павінны выцягнуць дзіця і дапамагчы яму справіцца з цяжкасцямі і дыягназамі, наколькі гэта будзе магчыма. За ўсе гады мы ні разу не адчулі прадузятых адносін да нас. Не было такога, што нас убачаць у пясочніцы — і ўцякуць. Многія мамы наадварот цікавяцца, задаюць пытанні».

На сёння Агата пражыла дзве аперацыі. Першая ў тры з паловай месяцы — на лёгачнай артэрыі, другая ў год і дзевяць месяцаў — радыкальная карэкцыя пароку сэрца. Праз некалькі месяцаў пасля апошняй аперацыі дзяўчынцы стала лягчэй. Яна пачала хадзіць больш упэўнена. З нараджэння дзіця знаходзілася на медыкаментозным лячэнні. Праз чатыры месяцы пасля аперацыі пачало адыходзіць ад медыкаментаў і цяпер спраўляецца без лекаў.

Бацькам Агаты заўсёды прыходзілася выбіраць паміж інтэлектуальным і фізічным здароўем малой. Вядома, фізічнае выходзіла на першае месца. Раней па стане здароўя даводзілася часта прапускаць заняткі ў тэрытарыяльным карэкцыйным цэнтры. Наведвае яго Агата ўжо другі год. Заняткі праходзяць тры разы на тыдзень па дзве гадзіны. Адзін дзень на тыдзень педагог займаецца з кожным дзіцем індывідуальна па 10—15 хвілін, другі дзень прысвячаецца групавым заняткам, а трэці праходзіць у гульнявой форме.

Праца ў цэнтры наладжана па прынцыпе традыцыйнага дзіцячага садка. Дзеткі вучацца распазнаваць колеры, формы, рэагаваць на просьбы, займаюцца музыкай. Малыя з сіндромам Даўна пазней пачынаюць гаварыць (прыкладна ў 3—4 гады), таму ім лягчэй мець зносіны з дапамогай жэстаў. Бацькі прысутнічаюць на такіх занятках і вучацца разам з дзецьмі, а карэкцыйны работнік падказвае, на што варта звярнуць увагу.

— У групе разам з Агатай займаюцца яшчэ дзевяць дзетак, — дзеліцца маці дзяўчынкі. — На жаль, амаль ва ўсіх іх ёсць слабыя месцы ў фізічным здароўі. Я ўпэўнілася, што «сонечныя дзеці» цудоўна развіваюцца і нічым, акрамя знешніх рыс, не адрозніваюцца ад астатніх. Ім проста патрэбна крышачку больш часу і дапамогі ў засваенні пэўных навыкаў. Агата шмат бярэ ад братоў, капіруе мадэль паводзін, звычкі. Яны разумеюць, што сястрычка слабейшая, што ёй трэба больш увагі.

Дзяцей з сіндромам Даўна называюць «сонечнымі», таму што яны ўмеюць радавацца без нагоды, а да жыцця і людзей ставяцца шчыра, з весялосцю. Яны знаходзяць шчасце ў простых рэчах. Напрыклад, Агата прачынаецца, пазірае ў акенца і пляскае ў далонькі, таму што пачаўся новы дзень, таму што свеціць сонца і родныя побач.

Стэрэатыпнае мысленне грамадства прыводзіць да таго, што сіндром Даўна адразу ўспрымаецца як няшчасце. «Спачатку трэба, каб людзі ўнікалі ў пытанне, а потым наляплялі цэтлікі на такіх дзетак і на такія сем'і, — разважае Сяргей. — У няпростай сітуацыі нельга звяртаць увагу на грамадскую думку і парады знаёмых. Рашэнне лепш прыняць у сям'і. Баяцца наогул няма чаго. Медыцына не стаіць на месцы, ёсць шмат карыснай дапаможнай літаратуры. Галоўнае, не думаць, што жыццё стане горшым ці наогул скончыцца. Наадварот, яно пачнецца наноў, яшчэ больш каштоўнае і глыбокае».

Вераніка УЛАСЕВІЧ.
veronika.ulasevich@mail.ru

Фота Кацярыны СЯРГЕЙ.
Сям'я ў поўным зборы.

«Дзяцей з сіндромам Даўна называюць «сонечнымі», таму што яны ўмеюць радавацца без нагоды, а да жыцця і людзей ставяцца шчыра, з весялосцю. Яны знаходзяць шчасце ў простых рэчах».

Даведка «Звязды»

У адным выпадку цяжарнасці з 700 дзіцяці ставяць сіндром Даўна. Прынатальная дыягностыка зменшыла колькасць нараджэння дзяцей з сіндромам: 1 да 1100, таму што многія ідуць на аборт. У цэлым, колькасць «сонечных людзей» складае 1,1—1,2% на кожную тысячу. Генетычная паталогія не залежыць ад ладу жыцця бацькоў, іх здароўя, шкодных звычак, харчавання, колеру скуры, нацыянальнасці, полу, клімату, а тым больш сацыяльнага статусу.

Што кажа псіхолаг?

Нэлі КСЯНЕВІЧ, аўтар кніг пра майстэрства жыць: «Калі бацькі нацэленыя толькі на здаровае дзіця, гэта трагедыя нас усіх. І бацькоў, таму што яны атрымалі не тое, што хацелі. І дзіцяці, якое прынесла чыстую душу і аказалася непатрэбным. І грамадства, таму што, не прымаючы іншых людзей, не такіх, як мы, фактычна мы не маем магчымасці змяняць свет да лепшага. Важна навучыцца прымаць свет такім, які ён ёсць, — з рознымі лёсамі і сітуацыямі. А ў зносінах з «сонечнымі дзеткамі» трэба быць такімі ж адкрытымі, як яны самі. Яны не сцерпяць хлусні, таму што адчуваюць яе інтуітыўна».

Паспяховыя людзі з сіндромам Даўна

• Карэн Гафні — першы чалавек з сіндромам Даўна, які здолеў пераплысці Ла-Манш, нягледзячы на паралізаваную нагу. Пасля гэтага Гафні стала залатой медалісткай Параалімпійскіх гульняў і атрымала дыплом ганаровага доктара Універсітэта Портланда.

• Цім Харыс — паспяховы рэстаратар. Яму належыць самы «таварыскі» рэстаран у свеце Tim's Place, дзе наведнікі, апрача традыцыйных спраў, атрымліваюць бясплатныя абдымкі. З моманту адкрыцця рэстарана ў 2010 годзе Цім абняў больш за 22 тысячы чалавек.

• Рональд Джэкінс — музыкант і кампазітар. Піяніна ён асвойвае ў 4 гады. У 17 пачынае выкладваць ролікі на YouTube. Яны хутка набіралі папулярнасць. Сёння Джэкінс запісвае студыйныя альбомы.

• Стэфані Гінз — першая актрыса з сіндромам Даўна ў гісторыі кінематографа. Фільм «Дуа» (1996 год) стаў сенсацыяй і атрымаў мноства ўзнагарод. Пазней Стэфані стала доктарам медыцынскіх навук, знялася ў рэкламе і паўдзельнічала ў некалькіх тэатральных пастаноўках.

• Марыя Няфедава — першы афіцыйна працаўладкаваны чалавек з сіндромам Даўна ў Расіі. Яна працуе памочнікам педагога ў цэнтры «Даўнсайд Ап». Таксама Марыя занятая ў пастаноўках «Тэатра Прастадушных» і грае на флейце.

У тэму

Наталля ДЗЕМІДЗЕНКА, выхавальнік цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі: «Дзеці з сіндромам Даўна на дзіва пяшчотныя і добрыя. Яны лёгка ідуць на кантакт: першыя абдымаюцца, вітаюцца з усімі. Зараджаюць станоўчай энергіяй на ўвесь дзень. Таксама я працую з дзеткамі-аўтыстамі і смела магу сказаць, што гэта зусім іншыя дзеці. Яны замкнёныя, любяць адзіноту. Часта «сонечныя дзеці» займаюцца ў групе разам з аўтыстамі. Тут узнікаюць пэўныя цяжкасці. Аўтысты хутчэй засвойваюць інфармацыю. Дзеці з сіндромам могуць закрычаць на занятках і ўзбударажыць астатніх. Сучасная практыка прыходзіць да інтэграцыі. Напэўна, гэта добра і для звычайных дзетак, якія атрымліваюць каштоўны вопыт у зносінах з незвычайнымі равеснікамі, і для дзяцей з асаблівасцямі развіцця, якім будзе на каго раўняцца».

■ Фотаздымак з гісторыяй

АБУЎ ВОРАГА Ў ЛАПЦІ

Гарачае лета 1942 года. Вёска Камуна Любанскага раёна. 16-гадовы Мікалай са сваёй мамай і малодшым братам жывуць у часовай зямлянцы, пабудаванай непадалёк ад спаленага фашыстамі вясковага клуба. Вёску, апетую Янкам Купалам у паэме «Над ракой Арэсай», акупанты ператварылі ў папялішча яшчэ ў ліпені 1941 года.

Балюча і крыўдна было на душы Мікалая. Вось учора ноччу старэйшы брат са сваімі сябрамі пайшлі ў Петрыкаўскі раён, дзе базіраваліся атрады Палескага злучэння, каб уступіць у партызаны. Як ні прасіўся Мікалай, яго не ўзялі з сабой. Сказалі: «Яшчэ малы, ды і зброі ў цябе няма, які з цябе партызан? Сядзі пакуль дома, яшчэ паспееш наваявацца!» «Бацька на фронце з 1941 года, цяпер брат з сябрамі стануць партызанамі, а я чым горшы за іх?..» Думкі Мікалая перапыніў тупат конскіх капытоў. Проста да яго набліжаўся партызанскі атрад імя К. Каліноўскага (пазней гэты атрад увайшоў у склад 25-й брыгады імя П.К. Панамарэнкі). Байцы атрада былі ў добрым настроі. Напярэдадні яны правялі паспяховую аперацыю па знішчэнні паліцаяў у вёсцы Кузмічы, захапілі шмат зброі і не страцілі пры гэтым ніводнага салдата.

Мікалай рашуча падышоў да камандзіра: «Вазьміце мяне ў атрад, хачу біць фашыстаў!» — «Біць фашыстаў гэта не лёгкая, а вельмі небяспечная справа, хлопча, і гэтаму трэба вучыцца. А вучыцца цяпер няма калі», — адказаў той і залічыў Мікалая спачатку ў гаспадарчы ўзвод.

Пераход праз балота партызан брыгады №25 імя П.К. Панамарэнкі.

Шмат баявых аперацый правёў атрад імя К. Каліноўскага ў тыле ворага. Я хачу расказаць са слоў майго дзядзькі Мікалая толькі пра адну, праведзеную ў 1944 годзе непадалёк ад маёй роднай вёскі Камуна.

«...Наш атрад заняў абарону ва ўрочышчы Забярвечча, за 600 метраў ад Камуны. Перад гэтым у пяць гадзін раніцы некалькі партызан (у тым ліку і я), пераапрануўшыся ў нямецкае адзенне, непрыкметна падкраліся да варожага дзота, які знаходзіўся на павароце дарогі на Сёмае. І пад выглядам змены каравула знішчылі двух кулямётчыкаў і вартавога. Самі ж замацаваліся ў гэтым дзоце.

Нашай групе было строга загадана пасля захопу дзота адкрываць агонь па карніках, калі тыя ўсёй калонай уцягнуцца на грэблю і дойдуць да моста. Потым не затрымлівацца, хутка далучацца да галоўнага атрада. «І асцярожна, каб вас свае не пабілі, не забывайце, якое на вас адзенне», — папярэдзіў нас камандзір.

А 8 гадзіне раніцы 3 лютага немцы пачалі наступленне. Нечакана для карнікаў наша група адкрыла агонь па хвасце калоны і з нямецкага дзота. У іх дзоце знаходзілася два кулямёты МГ-38 і поўныя скрыні патронаў.

Пасеяўшы паніку ў тыле калоны ворага і расстраляўшы нямала карнікаў, мы хутка пакінулі дзот і, прыхапіўшы два кулямёты і запасныя скрынкі з патронамі, злучыліся з галоўным атрадам. ...У выніку, панёсшы вялікія страты, фашысты павярнулі назад на Любань. Карная экспедыцыя была сарваная...»

У пачатку 1945 года Мікалай Маскальчук змагаўся ў складзе 286-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі бартавым стралком на самалёце-штурмавіку Іл-2-Д (двухмесны). Гэтай дывізіяй камандаваў палкоўнік Васіль Сталін (сын Сталіна). Воіны Чырвонай арміі называлі Іл-2 «лятаючым танкам», салдаты вермахта — «чумой» і «чорнай смерцю».

«Маёй задачай было абараняць самалёт ад нападу ззаду, — расказваў дзядзька. — Я знаходзіўся ў спецыяльнай кабіне з кулямётам. Звычайна мы грамілі ворага на вышыні 25—50 метраў. Убачыўшы наш самалёт над сваёй пазіцыяй, фашысты ў паніцы разбягаліся, хаваючыся ва ўкрыцце. Нам зусім не страшны быў агонь пяхоты, самалёт быў надзейна закрыты бранёй.

Часам нашы пілоты выкарыстоўвалі вонкавае падабенства Іла з нямецкім бамбардзіроўшчыкам Ju-87 (лапцёжнік) — шасі ў гэтага самалёта не ўбіралася і было падобнае на лапці. Нашы Ілы непрыкметна падляталі да нямецкіх самалётаў і знішчалі іх, але перад гэтым у паветры абавязкова выпускалі шасі. Гэты прыём называўся ў нашых пілотаў — абуць фашыстаў у лапці. З выпушчаным шасі наш самалёт здалёк амаль нічым не адрозніваўся ад нямецкага. На самалёце Іл-2 было магутнае ўзбраенне — дзве гарматы, два кулямёты, восем рэактыўных снарадаў, 600 кг бомбаў.

...2 мая 1945 года звяно нашых штурмавікоў знаходзілася ў небе над Берлінам. З вышыні птушынага палёту добра быў відаць палаючы Рэйхстаг. А над ім, на купале, чырвоны сцяг Перамогі. На душы было радасна, хацелася спяваць. У гэты дзень Берлінскі гарнізон капітуляваў...»

Берлін — 1945 год. Мікалай МАСКАЛЬЧУК (злева) з баявым сябрам.

Мой дзядзька Мікалай Міхайлавіч узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За адвагу», «За перамогу над Германіяй». Пасля вайны ён працаваў у калгасе. Разам з жонкай выхавалі чацвярых дзяцей. На жаль, партызан і паветраны стралок вельмі рана пайшоў з жыцця.

Міхаіл МАСКАЛЬЧУК.

Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца ■

Казачкі з антрэсоляў

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар. «СГ».)

Пад жывую музыку адна за адной ажываюць і іншыя казкі як савецкіх, так і замежных аўтараў: «Пра пана Трулялінскага», «Вожык у калючым кажушку», «Мумі Троль у джунглях», «Цмок і чараўнік»... Увесь гэты працэс ахутаны нейкай магіяй... Нездарма праектар раней называлі «чароўным ліхтаром».

— Памятаю, калі я была маленькай, то з нецярпеннем чакала вечара, — расказвае пасля прагляду Наталля. — Тады тэлевізараў было мала, таму ў нашым пакоі (а мы жылі ў інтэрнаце сямейнага тыпу) збіраліся ўсе суседскія дзеці, каб глядзець разам дыяфільмы... Мне падабаўся сам працэс падрыхтоўкі да прагляду. Мама завешвала вокны, нацягвала на дзверы белую прасціну — своеасаблівы партал у казачны свет... Тата даставаў з шафы дыяпраектар, зараджаў у яго стужку... Хоць дыяфільмы засталіся ў мінулым, сучасныя дзеці з такой жа цікавасцю прыходзяць на кожны наш новы паказ, каб акунуцца ў цёплую атмасферу «аналагавага» чараўніцтва, пачуць новыя ці ўжо забытыя старыя казкі, паказаныя незвычайным для іх спосабам.

Наталля — супрацоўніца Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры пры Акадэміі мастацтваў. Да дэкрэтнага водпуску рэалізоўвала там шэраг праектаў. Нараджэнне ж сына натхніла на новы — «Казачкі бай!».

— Спачатку разам з дзецьмі рабілі тэатр ценяў, — расказвае яна. — А потым, калі я знайшла стужкі з дыяфільмамі, прыйшла ідэя пераасэнсаваць казкі, якія тата чытаў у дзяцінстве, — шляхам незвычайнай агучкі.

Калі ў вас раптам завалялася непатрэбная скрынка з дыяфільмамі ці ў вашай калекцыі ёсць некалькі аднолькавых стужак, «Казачкі бай!» будуць рады прыняць іх у дар, каб ажывіць іх на наступных паказах.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Любімы дыяфільм сына Наталлі — «Муха-цакатуха».

Дзяўчына агучыла сваю ідэю, і яна знайшла водгук. Падтрымалі задумку Алена Гіранок з тэатра кінаакцёра, Антон Макуха з маладзёжнага тэатра, Дзмітрый Давідовіч з тэатра беларускай драматургіі, кінаакцёр Аляксандр Яфрэмаў, гітарыст Андрэй Еўдакімаў.

— Гэта як у тэатры. Напісана п'еса, а рэжысёр можа зрабіць нейкі новы арт-прадукт, прачытаць твор па-свойму. Мы робім штосьці падобнае. З аднаго боку, адраджаем тое, што было, з другога — ствараем новую форму, — кажа Андрэй Еўдакімаў. — Мы шмат імправізуем, вырашаем, з якой хуткасцю пераключаць кадры: на чым засяродзіць увагу, а дзе, наадварот, надаць рытм. Вырашылі ладзіць паказы асобна для дзяцей і для дарослых. Бо ёсць такія дыяфільмы, якія малым будуць незразумелыя. Напрыклад, павучальная грузінская народная казка «Разумная жонка». Мы закладаем асобны падтэкст — тое, што між радкоў можна прачытаць, — у тым ліку і ў музычную частку. Напрыклад, «Церамок» мы рабілі пад рэгі. Дзецям гэта будзе не зусім зразумела, таму тую ж казку для іх мы агучваем зусім па-іншаму.

— Раім прыводзіць дзяцей ад трох гадоў, — дадае Наталля, — бо па сваім сыне (а яму два гады) бачу, што дыяфільмы яго пакуль не цікавяць — цяжка засяродзіцца, сканцэнтравацца. Кліму цікава дастаць з каробачак стужкі, паразмотваць іх, пахадзіць перад ліхтаром — свае эксперыменты правесці. Адзінае, што ён глядзіць, — гэта «Муху-цакатуху», бо бачыць знаёмых персанажаў, чуе знаёмы тэкст.

— Бацькі пасля паказаў часта пытаюцца: «А дзе можна купіць гэтую штуку (маюць на ўвазе праектар)?» — працягвае Андрэй. — Па-першае, раім зазірнуць у свае камоды і шафы, паглядзець на атрэсолях у сваякоў. Там можа быць шмат чаго цікавага. Па-другое, хапае аб'яў у інтэрнэце...

— Нядаўна я натрапіла на адну цікавую аб'яву. Мужчына прадае дзесьці 300 дыяфільмаў. Вось гэта я разумею — калекцыя. У нас жа пакуль некалькі дзясяткаў стужак: тыя, што засталіся з майго дзяцінства, некалькі знайшла сярод рэчаў мужа і штук 15—20 прыдбала. Пераважная большасць — дзіцячыя казкі. Вельмі люблю гісторыю пра мумі-троляў. А таксама зраднілася з брытанскім дыяфільмам «Дзе ж Вілі?». Ён вельмі стылёвы, чорна-белы.

— Наталля, а ці ёсць у вашай калекцыі дыяфільмы на беларускай мове?

— На жаль, няма. Я, калі праглядала ў інтэрнэце чыюсьці калекцыю, знайшла адзін дыяфільм на беларускай мове, навукова-пазнавальны, пра птушак. У Беларусі не было студыі, якая б выпускала дыяфільмы. Але затое ў нас, у Рагачове, выраблялі прафесійныя праектары. Цяпер мы ладзім паказы з праектарам для дамашняга прагляду, той што застаўся з майго дзяцінства. Марым пра прафесійны, з лепшай оптыкай, які нават пры лёгкім зацямненні дазваляе рабіць добры малюнак. У планах — папаўненне калекцыі дыяфільмаў. Я, напрыклад, вельмі хацела б агучыць «Калабка». Сябры прывозілі паказаць з Піцера, з субтытрамі на рускай і англійскай мовах. Дык у мяне адразу нарадзілася ідэя для гэтай стужкі.

Калі ў вас раптам завалялася непатрэбная скрынка з дыяфільмамі ці ў вашай калекцыі ёсць некалькі аднолькавых стужак, «Казачкі бай!» будуць рады прыняць іх у дар, каб ажывіць іх на наступных паказах. Дарэчы, дагэтуль сеансы праходзілі час ад часу, бо не так проста знайсці прыдатнае памяшканне. Але перад выхадам гэтага тэксту Андрэй паведаміў радасную навіну: кіраўніцтва музея-майстэрні Заіра Азгура пайшло насустрач, і цяпер паказы дыяфільмаў будуць ладзіцца рэгулярна, раз на месяц.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.
dryla@zviazda.by

Фота Дар'і ДЗЕМІДЗЕНКІ.

Падчас дарослага паказу «Казкі ў фармаце 18х24», што прайшоў у кнігарні «Сон Гогаля».

ОАО "Беловежский"
БЕЛ·МОРИС

БЕЛАВЕЖСКІ

Наша газета часта расказвае пра справы ў адной з самых перадавых гаспадарак Беларусі — ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна. Заўтра ў гэтым буйным аграрным комплексе з замкнутым цыклам вытворчасці — справаздачны сход па выніках мінулага гаспадарчага года. Звычайна на такіх сходах размова ідзе пра ўзятыя вытворчыя і сацыяльныя вяршыні. Пра што раскажа акцыянерам генеральны дырэктар Юрый МАРОЗ гэтым разам? Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з Юрыем Дзмітрыевічам напярэдадні падзеі.

1. КАПЕЙКА ДА КАПЕЙКІ, МІЛЬЁН ДА МІЛЬЁНА

— Акцыянерам, як і чытачам найстаражэйшай беларускай газеты, будзе цікава даведацца апошнюю навіну: «Белавежскі» паспяхова паўдзельнічаў у найбольш прадстаўнічай выставе «Прадэкспа-2017», якая прайшла днямі ў Маскве, — распавядае Юрый Мароз. — Наша прадпрыемства ўдастоена ганаровых узнагарод — дыплома і кубка за высокую якасць прадукцыі як «Лепшае прадпрыемства — 2017». Прадукты зельц «Святочны» і «Мядзведжае вушка» ўзнагароджаны залатым медалём і дыпломам як «Лепшы прадукт — 2017». Адначасова праходзіў і міжнародны незалежны конкурс-дэгустацыя «Лепшы смак — 2017», і з улікам водгукаў спажыўцоў наша «Бужаніна запечаная па-белавежску» і сасіскі «Малочныя крэмавыя прэміум» атрымалі дыпломы першай ступені.

Цяпер пра вынікі работы за мінулы год. Маем права сказаць, што яны нядрэнныя: мы выканалі ўсе паказчыкі ў раслінаводстве і жывёлагадоўлі, і, адпаведна, выкананы ўсе эканамічныя паказчыкі. Прадалі прадукцыі больш чым на 96 мільёнаў. Выпрацоўка на аднаго працуючага склала 57 тысяч, а гэта на 10 працэнтаў вышэй узроўню 2015 года. Прыбытак значна большы, чым летась, рэнтабельнасць 17,3 працэнта.

У раслінаводстве год для нас быў вельмі ўдалым, такіх гадоў раней амаль не было. Упершыню сабралі 61 тысячу тон збожжа — разам з кукурузай. «Каралева палёў» дала 19 тысяч тон. Такім чынам, на 100 працэнтаў забяспечылі сябе збожжам, што з нашым размахам у жывёлагадоўлі вельмі важна.

Ураджайнасць, як і ў мінулы перыяд, склала 61 цэнтнер з гектара. Адна наша гаспадарка сабрала збожжа столькі, колькі не сабралі 45 раёнаў краіны. Мы даказалі таксама, што на складаных камянецкіх землях можна атрымаць і ўраджай буракоў 700 цэнтнераў з гектара. Хоць заўсёды лічылася, што больш за 300—350 цэнтнераў атрымаць нельга.

Калі далей гаварыць пра раслінаводства, то нарыхтавалі дастаткова кармоў — на 30 працэнтаў больш за мінулагоднюю колькасць. Быў створаны трывалы пераходны запас. На ўмоўную галаву жывёлы нарыхтавана 48 цэнтнераў кармавых адзінак, у тым ліку 36 — травяністых.

Прадукцыі раслінаводства на выхадзе атрымалі 140 працэнтаў да ўзроўню 2015 года. Гэта робіць усе нашы планы ў галіне жывёлагадоўлі і не менш амбіцыйныя планы ў перапрацоўцы цалкам рэальнымі.

А вось для жывёлагадоўчага комплексу год быў не простым, давялося папрацаваць, каб захаваць здароўе статка. Тым не менш мы прадалі 20 тысяч тон мяса, з якасцю таксама не горшай, чым у мінулыя гады. Зараз наш жывёлагадоўчы комплекс працуе нармальна, добрыя сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе былі і летась — 697 грамаў на дарошчванні і адкорме і 710 — на адкорме.

Зазначым, што менавіта комплекс дае 70 працэнтаў усёй прадукцыі «Белавежскага». Свініна мае рэнтабельнасць 19,7 працэнта. На фоне агульнай сітуацыі ў краіне, дзе свінагадоўля, на жаль, апынулася ў

пэўным заняпадзе (спадзяюся, што часовым), вынік гэта нядрэнны.

А 17 працэнтаў прадукцыі дае малако, гэта другое месца ў нашай вытворчасці па аб'ёмных паказчыках. І справа не толькі ў колькасці, бо 98 працэнтаў малака здаём найвышэйшым класам «экстра». Рэнтабельнасць яго — 44,2 працэнта.

Крышку «прабуксаваў» фірменны гандаль, хоць тавараабарот тут сур'ёзны. У магазінах, якія выкуплены намі, прыбытак. А дзе трэба ўносіць плату за арандаваныя плошчы, за іх ахову, электраэнергію і гэтак далей — пакуль наглядаюцца страты.

А ў цэлым прыбытак добры — 126 былых мільярдаў, сёння — 12,6

Цэнтр пасёлка «Белавежскі» з адміністрацыйнымі будынкамі — узор сучаснай аграрнай архітэктуры. А на ўскраіне вырастае яшчэ адна вуліца ўтульных катэджаў, названая ў гонар Юрыя Мароза. Усё яго жыццё фактычна звязана з гаспадаркай.

Хто ведае сапраўдную цану лічбам, той ацэніць і зразумее, якой напружанай калектыўнай працай яны дасягаюцца.

Чатыры мільёны (у новых грашах) атрымалі прыбытку ад малака, а ад свінагадоўлі 10 мільёнаў рублёў. На жаль, дала стратнасць ялавічына — замінусавала на сем працэнтаў. Што тлумачыцца, як мы лічым, пэўнай незбалансаванасцю цаны і затрат, як і паўсюдна па краіне.

Ганаровыя ўзнагароды «Прадэкспа-2017», пра якія расказваў генеральны дырэктар.

Далей пра тое, што датычыцца дойнага статка. Летась выраслі па малаку на 12 працэнтаў, і думаю, што не менш будзе і сёлета. Наша задача ў гэтым годзе — надаіць не менш за 8400 кілаграмаў на карову.

На сённяшні дзень дойны статак — 3500 кароў, за год павінна дадацца галоў 200, ставіць ёсць куды. Лічым, што вытворчасць малака — высокаэфектыўная, і дбаем пра яе.

Калі гаварыць пра перапрацоўчую галіну, пра наш мясакамбінат, то за межы Рэспублікі Беларусь павялічылі рэалізацыю свініны і ў два з паловай разы — каўбасных вырабаў. На гэтай базе ў тры разы павялічылася валютная выручка (да ўзроўню 2015 года).

Што датычыцца вытворчасці камбікармоў, то маем 67 тысяч тон прадукцыі (110 працэнтаў да мінулага ўзроўню). На камбікормавым заводзе запусцілі ўсе яго магутнасці, зараз дадаткова ўводзім грануляванне камбікармоў.

2. САМІ САБЕ ІНВЕСТАРЫ

— Апошнія пятнаццаць гадоў развіваемся ў асноўным за кошт уласных інвестыцый, — працягвае свой расказ генеральны дырэктар. — Аб'ём капітальных укладанняў у аб'екты вытворчага і сацыяльнага прызначэння складае цяпер 10 мільёнаў васемсот тысяч. Па-ранейшаму шмат будуем. Перш за ўсё працягваем актыўна весці рэканструкцыю комплексу. Гэта для нас на найбліжэйшы час задача нумар адзін. Хаця сур'ёзна працавалі і на малочнатаварных фермах. На дзвюх фермах замест традыцыйных даільных установак паставілі новыя, высокапрадукцыйныя.

Пабудавалі новую сушылку магутнасцю 60 тон за гадзіну з ёмістасцямі на 10 тысяч тон.

Што важна, не забыліся пра жыллё: узвялі адзінаццаць дамоў.

— Мы з вамі выйшлі ў размове на сацыяльную тэматыку...

— Заработная плата ў нас нармальная. Аператары па доглядзе жывёлы ў свінагадоўлі, якія дасягнулі добрых паказчыкаў, атрымліваюць мільёна дэнамінаваных беларускіх рублёў.

■ Зрабіць прафесію аграрыя паважанай — вось што патрэбна. Давайце шукаць стымулы.

да 800 рублёў. У аператараў машыннага даення, у якіх малако прадаецца класам «экстра», зарплата 900 рублёў. У механізатараў у напружаны час пасяўной ці ўборкі — да 1700, а зараз сярэдні заробак 600—650 рублёў. З 1 студзеня паднялі зарплату рабочых і спецыялістаў.

Акрамя таго, існуе натураплата, якую на гэты год мы павялічылі. Напрыклад, усе, хто прыйшоў працаваць на комплекс і яшчэ толькі вучыцца прафесіі, атрымлівае пяць кілаграмаў мяса на месяц незалежна ад паказчыкаў. І таксама тыя, хто працуе на малочнатаварных фермах і на адкорме. Больш сталыя, вопытныя работнікі атрымліваюць 15 кілаграмаў.

Маем кафэ, папулярнае сярод мясцовага насельніцтва. Праўда, затраты пакуль што перавышаюць іх заробкі, бо ў карэнную рэканструкцыю будынка пад кафэ былі ўкладзены пэўныя сродкі. Затое зараз людзям ёсць дзе адпачыць, правесці ўсе свае мерапрыемствы — дні нараджэння, вяселлі і іншыя.

3. ПЛАНЫ ЧАКАНЫЯ І... НЕЧАКАНЫЯ

— Мяркуючы па ўсім, вы вынікамі задаволены.

— Так, па выніковасці мінулы год для нас быў вельмі добрым. І закладзена нармальная аснова для будучага ўраджаю. Восеньскую пасяўную мы правялі ў тэрміны, пад поўную патрэбнасць унеслі ўгнаенні. І для веснавой пасяўной маем фактычна ўсё, насенне таксама, засталося крыху прыкупіць эліты. Нам на нашых цяжкіх, камяністых глебах трэба атрымаць гарантавана высокі ўраджай — не менш за 60–65 цэнтнераў з гектара, таму насенне

АБЫШОЎ 45 РАЁНАЎ

і патрэбна праверанае, раяніраванае, высокаўраджайнае. Раней мяне стараліся пераканаць, што ніколі нельга разлічваць у Камянецкім раёне на ўраджайнасць большую за 40 цэнтнераў. А мы стабільна атрымліваем больш за 60.

Цудоўна расце кукуруза — па 140 цэнтнераў, бо было насенне высокапрадукцыйных сартоў. Яно хоць і дарагое, але сябе апраўдала.

— Але Мароз не быў бы Морозам, калі б не думаў пра перспектыву...

— Запланавалі будаўніцтва каўбаснага цэха на 50 тон за суткі. Пачалі рабіць дакументацыю.

Але спачатку мусім зрабіць тую важную справу, пра якую ўпамінаў, — уцяпліць будынак свінагадоўчага комплексу пенапластавымі плітамі, а ўнутры ўзвесці яшчэ адну, тонкую сценку. Будынку сёлета споўніцца 35 гадоў, і такія меры не лішнія. Плюс новыя падлогі, новыя перагародкі, уцяпленне даху, глыбокая замена грунту і каналаў для выдалення гною. Што ў выніку дазволіць да мінімуму звесці спажыванне газу для ацяплення і забяспечыць санітарны парадак у карпусах, абароніць статак ад хвароб.

На комплексе створаны цудоўны калектыў спецыялістаў, рабочых, у новых умовах ім таксама працаваць будзе лягчэй.

Што датычыцца новага цэха для вытворчасці каўбасных вырабаў і паўфабрыкатаў, то сёння мы ў даволі абмежаваных умовах можам за суткі выпускаць 18 тон прадукцыі. Новыя магутнасці выведуць нас на новыя гарызонты.

А на вызваленых плошчах атрымаем магчымасць з паўнавартасных адходаў мясной вытворчасці наладзіць выпуск высакаякаснага харчавання для кошак і сабак. Пакуль такая прадукцыя за рэдкім выключэннем паступае з-за мяжы.

А ў перспектыве — будаўніцтва яшчэ адной сучаснай малочнатаварнай фермы на тысячу галоў, паколькі малако вельмі рэнтабельнае (за студзень гэтага года рэнтабельнасць склала больш за 60 працэнтаў).

З задач, якія зараз таксама трэба вырашаць у першую чаргу, — павышэнне сярэднясутачных прыбаўленняў у вазе на свінагадоўчым комплексе. Калі за мінулы год на адкорме было 710 грамаў, то сёлета павінны дабіцца не менш як 780 грамаў.

І ўжо цяпер клапоцяцца пра кармы, бо будуць кармы — будзе і прадукцыя. І павялічваць надоі малака.

Працаваць над якасцю прадукцыі. Якасць трэба трымаць, гэта аснова. Студзень адпрацавалі — ніводнага літра вышэйшай якасцю не прадалі, усё малако ішло класам «экстра». І на момант нашай з вамі размовы, а гэта сярэдзіна лютага, — таксама.

Вось пра ўсё гэта мы будзем гаварыць заўтра на сходзе. Асабіста мне ўпэўненасці надае тое, што ў «Белавежскім» — вельмі моцны калектыў, тут працуюць высокапрафесійныя спецыялісты, высокапрафесійныя намеснікі. 99 працэнтаў членаў калектыву — цудоўныя людзі, трымаюцца за работу абедзвюма рукамі.

■ Мы зараз пачалі шмат гаварыць пра нацыянальную ідэю. Самая галоўная нацыянальная ідэя — адзінства.

4. «І АМАЛЬ КОЖНЫ — ПАТЭНЦЫЙНЫ АРДЭНАНОСЕЦ»

— Ваша шматпрофільнасць — так цікавей працаваць для саміх? І — больш бяспечна?

— Больш бяспечна для гаспадаркі. Важна, што ў нас вытворчасць адладжана як часавы механізм. Сёння нам трэба атрымліваць 600 парасят за дзень — мы іх атрымаем. Камбікормавы завод павінен даць 200 тон камбікорму — значыць, яны будуць, чаго б ні каштавала. Кожны дзень патрэбна забіць не менш за 700 галоў свіней і на наступны дзень прадаць іх... Збояў у вытворчым ланцужку не павінна быць.

— У вас ёсць вопыт работы з адстаючымі гаспадаркамі, вы далучылі да чыннымі гаспадаркамі?

— Аб'ядноўваць з суб'ектамі гаспадарання, якім патрэбна сельскагаспадарчая прадукцыя ў якасці сыравіны, хто мае грошы, каб падняць «ляжачага». І такія лідары ёсць, у тым ліку ў прыватным сектары эканомікі. Разумны прыватнік пойдзе на такое аб'яднанне, бо яму патрэбна ўласная крыніца сыравіны. І не менш — паразуменне ў грамадстве, у кіраўніцкіх структурах. Такіх прыкладаў і ў нашай зоне дастаткова. А не аб'ядноўваць проста для галачкі. Паспешліваць вылезе наверх вельмі хутка, калі «лягуць» абодва.

Новы комплекс для сушкі збожжа ў аддзяленні «Расна».

З шырокім асартыментам экалагічна чыстай, высакаякаснай прадукцыі знаёміць начальнік мясакамбіната Лідзія РЫЖОВА.

Выцягваць адстаючых важна тым больш, што сёння сямімільнымі крокамі, з удзелам прыватнага капіталу (звярніце ўвагу) развіваецца вытворчасць свініны і мяса птушкі ў Расіі, і вельмі хутка можна апасацца канкурэнцыі з боку расіян нават на нашым рынку. Ужо сёння ў суседняй Бранскай вобласці на 15 комплексах на адкорме стаіць больш за мільён галоў свіней. У Белгародскай больш за два. Тое, што на ўсю Беларусь.

Там вельмі моцная падтрымка вытворцаў і з боку дзяржавы. Міністр сельскай гаспадаркі Расіі Аляксандр Ткачоў, былы губернатар Краснадарскага края, паставіў задачу за пяць гадоў, максімум за сем, закрыць уласныя патрэбы федэрацыі і ў малочнай прадукцыі. У якасці прыкладу прывёў Беларусь, беларускую схему.

Прыемна, вядома, але і трывожна. Улічваючы, што цяпер у іх крэдыты для вёскі — пад любыя праекты і пад 5 працэнтаў. І існуе адчувальная бюджэтная падтрымка нарошчвання малочнага статка і тэхнічнага пераўзбраення. Можна чакаць, што беларуская прадукцыя будзе з цягам часу выцясняцца з расійскага рынку.

Гэта — калі мы застанёмся стаяць на месцы ў вызначальных суадносінах «цана — якасць».

— Якую праблему для айчыннага аграпрамысловага комплексу вы маглі б вылучыць у якасці асноўнай?

— Кадравую. Падабраць нармальнага кіраўніка гаспадаркі часта складана. Лідараў сельскагаспадарчай вытворчасці трэба па-сапраўднаму рыхтаваць і па-сапраўднаму зацікавіць. Калі ёсць дэфіцыт падрыхтаваных кадраў, значыць, сістэма, якая існуе, не спрацоўвае.

Нельга згортваць праграму жыллёвага будаўніцтва на сяле. Прывабіць спецыяліста на вёску можна толькі жыллём.

А працу ў сельскай гаспадарцы варта аднесці да ліку найбольш паважаных, удзячных. Калі мы не ўсюды можам плаціць сельскаму чалавеку вялікія грошы, то давайце не саромецца гаварыць яму «дзякуй» за яго самаадданасць, за працу днём і ноччу. Мы шкадуем ордэны і медалі нават тым, хто іх заслугоўвае.

Не можам і не хочам друкаваць пустыя грошы, то давайце адальём дастаткова медалёў, яны не будуць «пустымі», і гэта стане вельмі адчувальнай падтрымкай для ўмацавання любога працоўнага калектыву.

Нейкім чынам мы забыліся пра маральныя стымулы, а цана ім паранейшаму высокая. Зрабіць прафесію аграрыя паважанай — вось што патрэбна.

У Амерыцы фермер — вельмі паважаны чалавек. Нашы фермеры працуюць не менш. Давайце шукаць стымулы.

У нашай гаспадарцы за 35 гадоў ніхто не атрымаў дзяржаўных узнагарод, і гэта пры нашых пастаянна высокіх паказчыках. Мы знойдзем, каго вылучыць на ўзнагароды — і даярку, і свінарку, і даглядчыка, і трактарыста... Усё гэта — цуд што за людзі! І з якім прыўзнятым настроем ардэнаносец будзе хадзіць на працу! Простыя ісціны, вельмі простыя, але забытыя.

Варта запаліць у прэстыжных сельскагаспадарчых ВНУ «зялёнае святло» для медалістаў — выпускнікоў вясковых школ, — прымаць іх без экзаменаў і без конкурсу, асабліва хлопцаў.

Плаціць студэнту за кошт гаспадаркі (а магчыма, і не толькі гаспадаркі) павышаную стыпендыю. Сказаць яму: «Ты потым гарантавана застаешся ў нас». Затрымаць у краіне ўсіх выдатнікаў сельскагаспадарчых ВНУ.

А пакуль нават выдатнікі — выпускнікі вясковых школ з'язджаюць у суседнюю Польшчу і Прыбалтыку, там можна паступіць без экзаменаў.

Павінна больш эфектыўна працаваць і сістэма падтрымкі сельгасвытворцаў за здадзеную прадукцыю.

Мы зараз пачалі шмат гаварыць пра нацыянальную ідэю. Самая галоўная нацыянальная ідэя, на мой погляд, — у адзінстве. Занадта многа разнастайных выклікаў навокал.

Спачатку давайце разам утрымаем на належным узроўні сваю сельскую гаспадарку, гарантуем уласную харчовую бяспеку. А потым пойдзем далей.

Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ад рэдакцыі. **Творчая брыгада шчыра дзякуе старшыні прафкама акцыянернага таварыства Валянціну Супрыновічу за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.**

УНП 200193456

Гэтыя дыпломы — таксама «трафеі» выставы ў Маскве «Прадэкспа-2017» — за найлепшы смак.

ШУКАЙЦЕ, ПАНЕНКІ, У ПЫЛЕ «БРЫЛЬЯНТЫ»

ПРЫЙШОЎ ТАТА — УПАЎ НА КАНАПУ?

В.Б.: Мужчына — гэта чалавек, упэўнены ў сабе, які не баіцца несці адказнасць за сябе і за сваіх блізкіх. І ў сілу гэтай адказнасці ён галоўны ў сям'і. Яго мужчынская справа — здабыванне рэсурсаў. Некалі гэта былі ўмоўныя «маманты», цяпер — грошы. А дом — гэта яго «крэпасць». Месца, дзе яго любяць і чакаюць. І дзе ён пачувае сябе ўтульна, дзе яго нішто не напружвае. Туды ён прыходзіць адпачыць душой і целам.

С.К.: І што атрымліваецца? Прыходзіш ты дадому, і адразу твая «палавінка» прыносіць табе тапкі і запрашае прылегчы на канапу? Я звар'яцеў бы праз месяц такога «адпачынку». Галоўны ён у сям'і... Ходзіць выключна на працу, зарабляе грошы... А хатняя гаспадарка — ужо не тваё? У шлюбе ўсё агульнае! Я, напрыклад, генеральную ўборку ў доме зрабіць магу, згатаваць святочную вячэру... Дый заплесці сваім дачушкам косы, у рэшце рэшт. І гэтая гатоўнасць дзяліць не толькі рамантычныя, але і бытавыя моманты яшчэ больш яднае людзей у шлюбе. Хаця наконт прыбірання ў хаце я крыху перабольшваю, бо дзве мае дачкі ўжо падраслі, і я цяпер магу спакойна кіраваць працэсам, седзячы на той самай канапе. Але сам алгарытм навядзення парадку мы з жонкай разам стваралі гада́мі.

В.Б.: Рэспект вам і «паважуха», як кажа моладзь. Але я таксама пры патрэбе дапамагаю жонцы: магу і ў хаце прыбраць, і прыгатаваць паесці, і пялюшкі дзіцяці памяняць. Але ж атмасферу ўтульнасці ў доме ўсё-ткі стварае жанчына. Кветачкі, фіраначкі, абрусікі... А мужчына застаецца здабытчыкам. Не ўсім фізічна стае часу, каб косы заплятаць. Бо каб забяспечыць сям'ю, мужчына часта працуе ў двух і болей месцах. І дадому прыходзіць з высалапленым языком. Натуральна, яму хочацца, каб да яго прыходу і вячэра была згатаваная, і ў хаце наведзены парадак. Бо ён «на перадавой». І лагічна, што тылавым забеспячэннем» мусіць займацца жонка.

С.К.: У вас, калега, дзіўнае ўспрыманне хатніх абавязкаў. А мне падабаецца пасля працы прыйсці і што-небудзь прыгатаваць. Некаторыя стравы ў мяне выходзяць лепей, чым у жонкі. Дзеці ад маёй піцы проста млеюць! Але ў маім гатаванні ёсць і выхаваўчы падтэкст. Яны глядзяць на бацьку і вучацца самі! Мая старэйшая дачка піцу «па-куркачоўску» робіць ужо не горш за мяне.

«Закіне злая доля на бязлюдны востраў — і што ты будзеш рабіць са сваімі грашыма? Есці іх? А мужчына, які ўсё ўмее, і хацінку збудуе, і ежу здабудзе, і зброю змайструе».

В.Б.: Гэта выдатна. Але можна зарабіць грошай і заказаць смачную піцу ад прафесійнага кухара. Мне таксама будзе прыемна, што магу пацешыць сваю сям'ю гэткім ласункам. А дзіця маё яшчэ досыць малое і маіх кулінарных вынаходак пакуль не зразумее.

С.К.: А гатаваць проста так, для душы ты не спрабаваў? Мне гэта эмацыянальную асалоду прыносіць! Таму што ёсць для каго кухарыць. І прыемна ўсведамляць, што я гэта ўмею. Бо многія мае знаёмыя таты нават да яечні не ведаюць, як падступіцца. А сапраўдны мужчына, на мой погляд, павінен умець не толькі здабыць «маманта», але і смачна засмажыць яго. Або патушыць. З агароднінай.

В.Б.: Вас паслухаеш, дык выходзіць, што мужыкам варта строем ісці запісвацца на кулінарныя курсы! Вядома, трэба ўмець гатаваць хаця б на ўзроўні выжывання. Каб і сам не сядзеў на батоне з кефірам, і дзецям мог нармальны пад'едак зладзіць, калі жонкі з нейкай прычыны няма дома. Але гэта не маё. Я гэтым займаюся толькі пры крайняй неабходнасці.

С.К.: А што тваё?

В.Б.: Ёсць больш мужчынскія абавязкі: прыбіць, прыкруціць, прыладзіць... Я лепей тройчы бачок унітаза адрамантую, чым стаяць увесь вечар каля пліты. Хаця і хатнія рамонты — таксама справа руцінная. Была б магчымасць, даверыў бы каму-небудзь іншаму.

С.К.: А я мяркую, што мужчына мусіць быць рукастым і ўмець рабіць усё. Адзінае выключэнне — электраправодка. Тут ужо кваліфікацыя патрэбная. Але смеху варта, калі дарослы мужык выклікае майстра, каб дзірку ў сцяне прасвідраваць! Мужчына павінен быць гаспадаром у хаце, як яго бацькі, дзяды і прадзеды. Гэта нават самаацэнку павышае, калі ты сам узяў і адрамантаваў.

В.Б.: Быць «рукастымі» нашых мужчын жыццё змушае. Думаю, многія з задавальненнем выклікалі б майстра, а самі ў гэты час глядзелі б футбол або чыталі кніжку. Але фінансы пяюць рамансы, таму даводзіцца ўсё рабіць сваімі рукамі. А калі ты можаш дазволіць сабе не калупацца ў сантэхніцы — гэта прыкмета твайго жыццёвага поспеху. Значыцца, ты досыць зарабляеш, каб наймаць спецыяліста. І гэта павышае самаацэнку значна болей, чым цурчанне адрамантаванага табой бачка.

С.К.: Ты забываеш, што ў хатняй працы ёсць выхаваўчы момант. Калі я нешта рамантую, мой сын глядзіць, запамінае, пачынае дапамагаць. Хай усведамляе сваю гендарную ролю. І ўвогуле, ніхто ж не ведае, з чым яму ў жыцці давядзецца сутыкнуцца. А калі ў армію пойдзе? А калі ў экстрэмальную сітуацыю трапіць? Закіне злая доля на бязлюдны востраў — і што ты будзеш рабіць са сваімі грашыма? Есці іх? А мужчына, які ўсё ўмее, і хацінку збудуе, і ежу здабудзе, і зброю змайструе. Словам, выжыве.

В.Б.: Эпоха рабінзонаў даўно мінула. І сітуацыі, пра якія вы гаворыце, — гэта з разраду фантастыкі. Вядома, навыкі фізічнай працы лішнімі не будуць, але лепей засяродзіцца на інтэлектуальным развіцці. Каб дзіця атрымала добрую адукацыю і зарабляла грошы галавой. Бо махаючы рыдлёўкай, фінансавага поспеху не дасягнеш.

АБЯЦАНАЯ ШАПКА ВУШЭЙ НЕ ГРЭЕ

С.К.: Ваша пакаленне пра што-небудзь іншае, апрача грошай, думае? Мы ў свой час умелі радавацца жыццю, не маючы ні хаты ні лапаты. Кахалі, жаніліся, нараджалі дзяцей. І адсутнасць грошай не ўспрымалі як трагедыю. Нам хапала таго, што мы былі маладыя, што перад намі ляжаў цэлы свет! А матэрыяльнае так ці інакш прыходзіла. А вы страцілі тое аптымістычнае адчуванне, якое было ў наш час.

В.Б.: А мне здаецца, што вы проста ідэалізуеце мінулае. Простыя радасці жыцця нікуды не зніклі. І магчымасцяў для атрымання асалоды стала нават болей. Але большыя магчымасці патрабуюць большых грошай. І гэта нармальна, калі малады чалавек думае пра будучыню. Калі на момант стварэння сям'і ён хоча мець кватэру, машыну, нейкія накапленні. Дый паненкі сталі больш пераборлівымі: яны жадаюць сабе больш заможнага спадарожніка жыцця. І ў гэтым маюць рацыю.

С.К.: Абяцаная шапка вушэй не грэе. І паненка, што чакае прынца на белым «мерседэсе», можа ўсё жыццё і прачакаць. І ўпусціць хай небагатага, але харошага хлопца, з якім магла б быць шчаслівай. Таму, паненкі, пры выбары спадарожніка жыцця ўмейце разглядзець «брыльянт у пыле».

В.Б.: Аднак што ні кажыце, але калі хлопец спачатку будзе заможным, то сэрца дзяўчыны яму будзе прасцей скарыць. Усё-ткі мільянера прыемней кахаць, чым жабрака. Калі ён можа дарыць кветкі, здзіўляць прыемнымі сюрпрызамі...

Фота Надзеі БУЖАН.

Сяргей Куркач. Сёлета адзначае 50 гадоў. З іх 21 год працуе ў «Звяздзе». Мае траіх дзяцей: дзвюх дарослых дачок і дзевяцігадовага сына. Захапляецца паэзіяй, настольным футболам і гатаваннем страў з мяса і рыбы.

С.К.: Магу расказаць табе гісторыю са свайго юнацтва. Блізіўся дзень нараджэння маёй будучай жонкі, а грошай у мяне было толькі на тры гваздзікі. І я хадзіў па прыватным сектары і прасіў у гаспадароў па дзве-тры ружы для сваёй каханай дзяўчыны. І людзі ішлі насустрач і аддавалі свае самыя прыгожыя кветкі. У выніку назбіралася цэлае вядро прыгажэнных руж — дваццаць пяць штук. Акурат столькі гадоў тады спаўнялася імянінніцы. Бачыш: можна зрабіць для дзяўчыны феерычны сюрпрыз і без грошай.

В.Б.: У наш час гэта не так проста, як было некалі. Не толькі дзяўчаты, але і людзі ўвогуле сталі больш меркантыльнымі. Хацеў бы я паглядзець, як бы вы цяпер прайшліся па катэджавым пасёлку і папрасілі кветак!.. І паслухаць, якімі словамі вам бы адказалі. Добра гэта ці кепска, але факт: чалавека сталі ацэньваць найперш па вонкавым выглядзе і сацыяльным статусе.

КОНІК МАЛЕНЬКІ, ДЫ ЗАЛАЦЕНЬКІ

С.К.: Калі пачуцці сапраўдныя, то ні багацце, ні знешнасць ролі не адыгрываюць. Я ў свой час не меў грошай і не быў ні высокім бландзінам, ні смуглявым мача з чорнай барадой. Сэрца сваёй жонкі я скарыў тым, што цэлымі гадзінамі чытаў ёй вершы, параўноўваў яе вочы з зоркамі. І вячэра, прыгатаваная мной са звычайных прадуктаў, уразіла яе болей, чым тыя далікатэсы, што я заказваў у рэстаране. Бо ёй са мной было ЦІКАВА. І гэта галоўнае. Хаця я згодны з тым, што мужчына павінен быць здабытчыкам. Але ёсць рэчы, даражэйшыя за грошы. Гэта чуласць, душэўнасць і гатоўнасць да кампрамісаў. Сапраўдны мужчына — гэта не той, хто прэцца па жыцці, нібы танк. Ён, хутчэй, грузавік, каторы бярэ і вязе свой груз.

В.Б.: А як жа прынцып «хто паспеў — той і з'еў»? У нашым грамадстве даўно дзейнічаюць «законы джунгляў». Кожны стараецца ўрваць для сябе смачнейшы кавалак. І калі ў цябе ёсць сіла, зубы і кіпцюры, то ў цябе болей шанцаў.

С.К.: Але такі падыход не заўсёды апраўданы. Мужчына павінен праяўляць вытрымку. Як рыбак, што гадзінамі чакае, пакуль рыба «торкне». У свой час у сталіцы ў мяне была праца, якая падабалася, але не давала вялікіх грошай. І не было ні жылля ў Мінску, ні перспектывы яго пабудаваць. «Залатога запасу» я таксама не меў. І ўзнікла думка з'ехаць у Лепель або Ляхавічы, дзе хаця б з кватэрай няма праблемы. Але я не стаў прымаць рашэнні на эмоцыях. І вырашыў застацца з сям'ёй у Мінску. І жонка мяне падтрымала. Хаця адказнасць на мяне лягла велічэзная. З цягам часу кватэрнае пытанне вырашылася і быт наладзіўся. І ты, дарэчы, прыехаў у Мінск з такім жа «капіталам», што і я ў свой час. Аднак не адмаўляешся ад свайго намеру.

В.Б.: Не адмаўляюся, бо мужчына павінен дабівацца сваіх мэт. А прыкрываць бяздзейнасць неспрыяльнымі абставінамі можа толькі слабы духам чалавек. Ідэальна спрыяльнымі абставіны ніколі не будуць. Калі ёсць рукі, ногі, галава, то табе нішто не замінае ісці наперад. Акрамя тых перашкод, якія ты сам сабе напрыдумляў.

С.К.: Згодны. Толькі дазволь даць адну параду: мужчына павінен праяўляць не толькі сілу, але і мудрасць. Ён нібы дрэва, якое гнецца пад ветрам, але не ламаецца.

ПІЦА ПА-КУРКАЧОЎСКУ

Купіць у краме дражджавое цеста. Круглую бляху (дыяметрам 40—50 см) змазаць маргарынам! Выкласці на яе цеста тонкім слоем. Размазаць па паверхні цеста паўтары сталовыя лыжкі кетчупу. Зверху выкласці адвараную і парэзаную кураціну (колькі не шкада). Замест яе таксама можна выкарыстаць цяляціну, нятлустую свініну, філе рабчыкаў — усё, што здолееце здабыць. Мяса прысыпаць дробна парэзанай цыбуляй (палова сярэдняй цыбулі-ны, пажадана салодкай чырвонай). Нарэзаць лустачкамі 3—4 невялікія свежыя шампіньёны і рассыпаць па піцы. Прыцерушыць сушаным часнаком або іншай прыправай (якую знойдзеце). Пракалоць у пакеціку маянэзу маленечкую дзірачку і зрабіць на паверхні стравы маянэзную «сетачку». Натаркаваць на буйной тарцы цвёрды сыр (100—150 г) і прысыпаць ім піцу.

Больш урачысты варыянт: замест грыбоў — лушчаныя крэветкі, замест цыбулі — салодкі чырвоны перац, а замест кетчупу — свежыя памідоры.

Распаліць духоўку да 200°С і паставіць у яе піцу на 20—25 хвілін. Але канчатковая гатоўнасць вызначаецца па густым водары расплаўленага сыру. Смачна есці!

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Валянцін Бойка. Узрост — 32 гады. З іх 7 гадоў шчыраваў на ніве рэгіянальнай журналістыкі. Стаж у «Звяздзе» пакуль невялікі. Выхоўвае шасцігадовага сына. Захапляецца інтэлектуальнымі гульнямі. Выдатна гатуе яечню з салам.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

■ На свае вочы

СІЛА Ў РОЗУМЕ, або Паддайся, каб перамагчы



З гімнастыкай у сына не зладзілася. Зала была занадта вялікая, а малы занадта актыўны, не мог супакоіцца, пакуль не аббягаў яе ўздоўж і ўпоперак. Карацей, карысці ад заняткаў было няшмат. У якасці альтэрнатывы пачалі шукаць спартыўныя секцыі. «Натрапілі» на ўсходнія адзінаборствы... Дарэчы, падчас заняткаў тут вывучаюць і гімнастычныя элементы. А яшчэ чула, што ў кожнага з відаў баявога майстэрства існуе свая філасофія, якая не развівае ў дзіцяці непатрэбнай агрэсіі. Завітала на заняткі (першы, як правіла, заўсёды бясплатны) у адзін з клубаў дзюдо.

— Рэй! — гучна вітаецца трэнер клуба «Тыгр», майстар спорту міжнароднага класа (3-і дан) па дзюдо Аляксандр СЦЯШЭНКА з вучнямі, адзетымі ў белыя і сінія кімано, і робіць паклон. Тыя кланяюцца ў адказ. Так пачынаецца кожны занятак. Потым размінка: скачкі, кулькі, гімнастычныя практыкаванні — толькі паспявай. Адны дзеці адразу «ўключыліся» і старанна выконваюць каманды трэнера, другія — здаецца, толькі пасля школьных заняткаў — ніяк не могуць сканцэнтравацца, адцягваюцца на размовы. Але пачынаюцца парныя заняткі — адпрацоўваюць захопы, кідкі з такой хуткасцю! Тут ужо не да гаворкі. Спрацоўвае жаданне перамагчы. Або ты, або цябе.

Падчас трэніроўкі прыкмеціла хлопчыка. На выгляд гадоў 9-10, а такі сур'ёзны позірк. Ён упэўнена ўступаў у барацьбу, гэтак жа ўпэўнена перамагаў і заставаўся абсалютна спакойным знешне. Пасля заняткаў падышла пазнаёміцца. Аказалася, Даніла займаецца дзюдо ўжо чатыры гады, раней наведваў спартыўную секцыю, якая і сёння працуе на базе школы. Трэніроўкі прыносяць яму вялікае задавальненне, і ён марыць стаць прафесійным спартсменам.

Затрымала ў дзвярах бацьку і маці, пытаюся: каго прывялі на заняткі? Горда кажуць, што Алісу. Дзяўчынка займаецца дзюдо ўжо два гады. На пытанне навошта, бацька, не задумваючыся адказаў, што бачыць дачку ў будучыні ў прафесійным спорце, да таго ж для здароў'я карысна.

Увогуле, у клубе займаюцца хлопцы і дзяўчаты ад 4 да 16 гадоў. Зразумела, падыходы да груп адрозніваюцца. У самых маленькіх заняткі, як звычайна, праходзяць у гульнявой форме. «Пакажыце, як скача жаба, папаўзём, як прусак», — кажа трэнер. Маляняты яшчэ не вывучаюць сапраўдныя баявыя элементы, але трэніруюць лоўкасць, спрытнасць, гнуткасць. Пакуль што займаюцца ў звычайнай спартыўнай форме, праз год — пачнуць у кімано.

У старэйшых групах усё больш сур'ёзна. Практыкаванні з кожным разам ускладняюцца, а першасная задача — перамагчы саперніка любым дазволеным спосабам.

Заняткі ў клубе галоўным чынам накіраваны на аздараўленне, падтрыманне добрай спартыўнай формы дзяцей. На жаль, фізічнае здароўе многіх, хто прыходзіць упершыню, пакідае жадаць лепшага.

— Сучасныя дзеці вядуць маларухомы лад жыцця, — кажа Аляксандр Сцяшэнка. — Многія гадзінамі праседжваюць за камп'ютарамі і тэлефонамі. Адсюль слабасць цягліц, скрыўленне пазваночніка. Як ні дзіўна, але некаторыя дзеці не могуць прысесці, не тое што адціснуцца ці падцягнуцца. Але, калі ёсць жаданне і прыкласці намаганні, можна ўсё выправіць.

Акрамя аздараўлення, рэгулярныя трэніроўкі робяць дзяцей больш настойлівымі ў дасягненні мэт, дысцыплінаванымі, навучаюць захоўваць самавалоданне у стрэсавых сітуацыях.

Дзюдо прыйшло да нас з Японіі, назва перакладаецца як «мяккі шлях». Мяккі ні ў якім разе не значыць лёгкі. Галоўным чынам дзюдаісты імкнуцца дасягнуць фізічнага самаўдасканалення, духоўнай гармоніі і пастаянна развіваюцца інтэлектуальна.

— Насамрэч, каб стаць сапраўдным майстрам, трэба быць усебакова моцным, — сцвярджае трэнер. — На занятках вывучаем элементы гімнастыкі і акрабатыкі, трэніруем каардынацыю, практыкуем лёгкую атлетыку.

Такім чынам, паступова развіваецца цягавітасць, памяць. Не менш важнае для дзюдаіста аналітычнае мысленне.

— Калі ў звычайным жыцці сіла часта становіцца галоўным крытэрыем перамогі, то дзюдо вучыць тактыцы, прымушае думаць, бо хітрасць перамагае моц: паддайся, каб перамагчы, выкарыстай сілу праціўніка супраць яго самога — вось чым кіруюцца спартсмены, — падкрэслівае трэнер. — Біць можна навучыць любога, а каб навучыць змагацца, спатрэбіцца шмат часу.

Дарэчы, дэманстраваць сваю моц і навыкі ў барацьбе можна толькі ў спартыўнай зале, або калі адчуваеш пагрозу свайму жыццю — гэта вучні клуба ведаюць дасканала. Галоўнае — паставіць крыўдзіцеля ў бездапаможнае становішча, ніякай агрэсіі.

Не менш увагі трэнеры-дзюдаісты ўдзяляюць выхаванню сваіх вучняў. Не толькі кожная трэніроўка, але і паядынак пачынаецца з паклону — своеасаблівага вітання. Тым самым сапернікі паказваюць павагу адзін да аднаго, «абяцаюць», што не будуць выкарыстоўваць забароненых прыёмаў. Абавязковай лічыцца павага да трэнера, нельга яму пярэчыць, спрачацца з ім, за ім апошняе слова. Тое самае датычыцца і старэйшых людзей. Таксама ўвага ўдзяляецца чысціні, ахайнасці, бо займаюцца басанож.

Відавочна, усе гэтыя навыкі будуць на карысць любому дзіцяці ў будучыні, нават калі яно не стане спартсменам.

Дзюдо лічыцца адным з «самых дэмакратычных» відаў барацьбы, бо займацца ім можа амаль кожны, незалежна ад полу, узросту, памераў і складу характару. Адсутнасць удараў робіць яго адным з найменш траўманебяспечных. Супрацьпаказаннямі для заняткаў могуць стаць захворванні сэрца, нырак, вачэй, паталогія шыйнага аддзела пазваночніка.

Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ

■

Фота Надзеі БУЖАН.

У БАЦЬКОЎСКІ НАТАТНІК

Калі перад бацькамі паўстае пытанне, у якую спартыўную секцыю аддаць дзіця, некаторыя аказваюцца ў разгубленасці. Ад мноства назваў баявых майстэрстваў разбягаюцца вочы. Да таго ж адзінаборствы, здаецца, падобныя паміж сабой. Вось наш маленькі дапаможнік.

Ушу (яно ж кунг-фу) — кітайская сістэма псіхафізічных практыкаванняў, дае раўнамерную нагрузку на ўсе групы цягліц. Не развівае агрэсію, а, наадварот, вучыць сыходзіць ад канфліктаў. На трэніроўках адсутнічаюць спарынгі. Падыдзе нават самым маленькім: і хлопчыкам, і дзяўчынкам.

Тэквандо — карэйскі варыянт усходніх адзінаборстваў. Дамінуе тэхніка ўдараў нагамі. Яна небяспечная, і яе даволі цяжка выкарыстоўваць, бо тэхніка заснавана не на сіле, а на хуткасці. Многія з прыёмаў накіраваны не на тое, каб абясшкодзіць саперніка, а на набор балаў. Падыходзіць для хударлявых дзяцей.

Айкідо — японскае адзінаборства. Гэта выключна сістэма абароны. Айкідаіст рухаецца па крузе, што дазваляе пазбегнуць прамой сутычкі. Усе рухі павінны быць плаўнымі, але гарантаваць абарону. Сапраўдны майстар можа «бачыць» намеры праціўніка і прадухіляць яго дзеянні. Ад дзіцяці айкідо патрабуе адказнасці і дысцыпліны, даволі вялікія фізічныя нагрузкі. Пачынаць заняткі можна з самага ранняга ўзросту.

Капаэйра — афра-бразільскае баявое майстэрства, якое спалучае барацьбу, акрабатыку і танец. Гэта комплекс рухаў, якія паўтараюцца і мяняюцца ў залежнасці ад рэакцыі саперніка. Заняткі праходзяць пад акампанемент традыцыйных бразільскіх інструментаў і песень, што развівае пачуццё рытму і асабліва падабаецца дзецям. Трэніроўкі нагадваюць гульню і лёгка засвойваюцца. Пачынаць займацца можна з трох гадоў.

Каратэ — японскае баявое майстэрства без зброі, назва перакладаецца як «пустая рука». Даволі небяспечны від барацьбы, вядома, што каратысты могуць разбіваць цагліны рукамі і нават галавой. Для дзяцей падыдзе бескантактавы метад барацьбы, які развівае гнуткасць, спрытнасць, трэніруе рэакцыю. У каратэ шмат рэзкіх паваротаў, скачкоў, таму яно не рэкамендуецца для дзяцей з хваробамі пазваночніка, вачэй, пры артрытах. Прыводзіць дзяцей на заняткі можна з 5—7 гадоў.

Самба — спалучэнне рукапашнага бою, барацьбы, захопаў, болевых прыёмаў — таго, што выкарыстоўваецца падчас самаабароны. У філасофіі адзінаборства ўпор робіцца на сілу духу, патрыятызм, абарону дому, сям'і.

Класічная (грэка-рымская) барацьба — еўрапейскае адзінаборства, у якім з дапамогай прыёмаў трэба вывесці саперніка з раўнавагі і прыціснуць лапаткамі да дывана. Можна займацца з 8—10 гадоў.

Вольная барацьба — адрозніваецца ад класічнай тым, што дазваляецца захопліваць ногі праціўніка, рабіць падсечкі.

Бокс — траўманебяспечны від спорту, у якім сапернікі наносяць удары адзін аднаму ў спецыяльных пальчатках.

Кікбоксінг (тайскі бокс) — адно з самых жорсткіх адзінаборстваў. «Выжыць любой цаной» — яго дэвіз. Часткова нагадвае бокс, але дазваляюцца ўдары нагамі і пэўныя ўдары рукамі, якія забаронены ў боксе.

Вольнай барацьбой, боксам, кікбоксінгам можна займацца не раней за 10—12 гадоў. Падыходзіць для дужых, актыўных дзяцей.

Пры выбары спартыўнай секцыі для дзіцяці бацькі ў першую чаргу павінны ўлічваць яго жаданне.

Дыялог з дзіцем, якога ніколі не білі

«Нядаўна я прачытала ў Фэйсбуку пост, які прымусіў мяне задумацца, — дзеліцца Аляксандра. — Гэта сціслы варыянт размовы маці з сынам шасці гадоў, якога ніколі не білі. Я лічу, што яго варта прачытаць усім бацькам, у тым ліку і будучым.

«С. *(дзіця)*: Мам, мне трэба з табой пагаварыць.

М. *(мама)*: Так, слухаю цябе.

С.: Ведаеш, а бацькі б'юць П. (хлопчык, 7 гадоў, імя не называю з этычных меркаванняў)...

М.: І што ты думаеш з гэтай нагоды?

С.: Гэта дрэнна. Так нельга.

М.: А чаму? Чаму нельга біць дзяцей?

С.: Ну, таму што, калі бацькі будуць біць П., ён стане злым і будзе ўсіх крыўдзіць. А яшчэ, ён вырасце, у яго будуць дзеці, і ён будзе іх біць. Потым дзеці П. вырастуць, таксама стануць злымі і будуць біць сваіх дзяцей і пойдзе ланцуговая рэакцыя. Ну і потым, мама, пройдзе час, П. вырасце, а яго бацькі стануць старэнькімі, і ён зможа іх біць, як яны гэта робяць цяпер, яны, што, гэтага не разумеюць?

М.: А калі яго бацькі б'юць?

С.: Калі ён зрабіў вельмі маленькую гадасць.

М.: А як з твайго пункту гледжання правільна паступаць з дзецьмі, калі яны робяць штосьці дрэннае?

С.: Калі вельмі маленькую гадасць зрабіла дзіця, яму трэба сказаць, што гэта няправільна, і растлумачыць чаму. Калі вялікую — бацькі могуць на яго пасварыцца. Але біць — гэта зусім няправільна.

М.: А як, на твой погляд, трэба сварыцца на дзяцей так, каб яны не рабілі больш гадасцяў?

С.: Можна трошкі пакрычаць, але трэба тлумачыць, чаму яны крычаць.

М.: А што можна зрабіць, каб бацькі П. перасталі яго біць?

С.: Думаю, П. павінен сказаць ім, што яму гэта не падабаецца.

М.: А калі гэта не дапаможа?

С.: Настаяць на гэтым.

М.: А калі і гэта не дапаможа?

С.: Расказаць бабулі, дзядулю, каб яны яго абаранілі. Хоць у П. дзядулі няма... Тады проста бабулі расказаць, яна павінна дапамагчы. Бабулі добрыя. А яшчэ цётцы, дзядзьку, ну хоць каму-небудзь з дарослых. Нехта ж павінен быць з ім побач, каб абараніць. Ён жа дзіця.

М.: Скажы, калі ласка, а многіх з тваіх сяброў б'юць бацькі?

С.: Нікога. П. мне не сябар, таму з маіх сяброў не б'юць нікога. Наогул, П. — адзіны з дзяцей, якіх я ведаю, каго б'юць».

У чаканні вясны

«Памідоры цяпер прадаюць хваравітыя нейкія, — піша Таццяна Лукашэвіч. — Ні колеру, ні смаку, ні паху. Адзін чорт, з Турцыі, Іспаніі іх везлі або з Парніковай у Мінску. Разрэжаш адзін такі няшчасны, ён светлым сокам пральецца і садзьмецца, не аддаўшы нічога, што мог бы аддаць памідор.

Іншая справа свойскія, вырашчаныя мамай на агародзе. Яна іх яшчэ з зімы замочвае семкамі, потым прарошчвае ў мокрай тканіне, расаду ў пластыкавых ёмістасцях на падаконніку трымае. Ну а потым усё як доктар прапісаў: высаджвае, палівае, пасынкуе, падвязвае. Кожнае лета палова яе душы застаецца ў гэтых памідорах, і яны ёй плацяць тым жа.

Пакладзеш на дошку такі памідор, а ён — яркі, шчыльны, наліўны. У разрэзе мясісты, сакавіты і такі жывы. Яшчэ крыху, і, здаецца, загаворыць пад тваімі пальцамі. Такія памідоры просяць буйной солі і шмат смятаны. Можна пятрушкі, але гэта справа густу, вядома. Пасля другой лыжкі летняй салаты душа нясецца ў рай. Там і сядзіць, пакуль міска не апусцее. І яшчэ хвілін пятнаццаць пасля гэтага, пакуль прыйдзеш у сябе пасля невыноснага шчасця. Гэта я да чаго: зіма абрыдла, арганізм просіць святла і сонца. І, вядома, маміных памідораў».

Па-ранейшаму заклікаем вас, шаноўныя чытачы, дзяліцца з «Сямейнай газетай» сваімі думкамі, назіраннямі, парадамі, арыгінальнымі ідэямі. Чакаем вашых лістоў.

■ Беларусікі

НЯСТОМНЫ ВАНДРОЎНІК

«Першы наш буйны «выхад у свет» з маленькім Паўлікам быў у пазамінулым годзе, на свята 9 Мая. Сыночку тады было 7 месяцаў і большасць святочных падзей ён... праспаў, — піша Ірына, матуля Паўліка Плецяжова з Гомеля. —

Затое летась на тое ж свята малы ўжо весела тупаў па залах музея вайсковай славы. А сёлета, несумненна, аблазіць усю выстаўку баявой тэхнікі! Мы з Паўлікам любім падарожнічаць. Пакуль што вандруем па Гомельскай вобласці, без аўто — на цягніку, маршрутках. Пабывалі ўжо ў Добрушы, дзе знаходзіцца будынак папяровай фабрыкі, узведзены ў канцы XIX стагоддзя, у Калінкавічах...»

Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымачкі вашых дзетак, унукаў, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім аповедам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз!

■ Увага! Новы конкурс!

Як запомніць колеры вясёлкі

Днямі я з дзецьмі маіх сяброў — амаль трохгадовай Юстынкай і пяцігадовым Янкам — малявала вясёлку. І мне захацелася падказаць ім, як лёгка запомніць колеры і іх паслядоўнасць. Першае, што прыгадалася: «Каждый Охотник Желает Знать Где Сидит Фазан» і «Как Однажды Жак Звонарь Головой Сломал Фонарь». Гэтыя запаміналкі, думаю, ведаюць усе з дзяцінства. Але ж мае сябры выхоўваюць дзяцей па-беларуску, таму захацелася прыдумаць штосьці сваё, адметнае. Вось што ў мяне атрымалася: «Чароўны Аловак Жаданне Здзейсніць, Бо Сам Фантазёр» (першыя літары кожнага слова з'яўляюцца першымі літарамі колеру: чырвоны — аранжавы — жоўты — зялёны — блакітны — сіні — фіялетавы). Потым ужо знайшла ў вікіпедыі іншыя падказкі:

- чалавек абачлівы жонку заўсёды сабе бярэ файную;
- чаму птах журботны зранку? Бо сапсута філіжанка;
- чэшскі пан жадае зноў бачыць сорак фазаноў;
- чакаю апетытных жабак з беларускіх сажалак. Француз.

І вось (дарэчы, у дзень роднай мовы) у мяне нарадзілася ідэя правесці конкурс сярод чытачоў «Сямейнай газеты» на найлепшую беларускамоўную падказку-запаміналку паслядоўнасці колераў вясёлкі. Мамы і таты, бабулі і дзядулі, прыдумляйце самі і падключайце сваіх дзетак. Пераможцу чакае неймаверна душэўны прыз (на фота) — экалагічная цацка з дрэва. Свае «вясёлкавыя» варыянты дасылайце на адрас «Звязды» альбо па электроннай пошце nadzieja@zviazda.by

Надзея ДРЫНДРОЖЫК. *dryla@zviazda.by*

■ Шпаргалка для дарослых

20 СПОСАБАЎ ДАВЕДАЦЦА, ЯК СПРАВЫ Ў ШКОЛЕ,

не пытаючыся «Ну, як справы ў школе?»

Калі вы спытаеце ў дзіцяці: «Ну, як там у школе?», то, хутчэй за ўсё, пачуеце ў адказ дзяжурнае: «Нармальна». Многія бацькі задавольваюцца гэтым і працягваюць спакойна займацца сваімі справамі. І дарэмна. На такіх адносінах давер не пабудуеш. З дзецьмі трэба размаўляць на розныя тэмы штодзень, нягледзячы на занятасць і стомленасць. Інакш яны, і гэта непазбежна, будуць аддаляцца. Калі ж вы сапраўды хочаце даведацца, як прайшоў дзень у вашага сына (дачкі), то задайце такія пытанні, на якія яму (ёй) цікава будзе адказваць. Вось толькі некалькі магчымых варыянтаў — своеасаблівая міні-шпаргалка, якую вы можаце дапаўняць і змяняць самі ў залежнасці ад сітуацыі і ўзросту вашых дзяцей:

1. Што самае добрае з таго, што адбылося з табой сёння ў школе?

2. Што найгоршае з таго, што адбылося з табой сёння ў школе?

3. Цябе штосьці сёння насмяшыла? Раскажы пра гэта.

4. Калі б ты мог выбраць, з кім бы ты хацеў сядзець у класе за адной партай?

5. А з кім бы не хацеў сядзець? Чаму?

6. Раскажы мне пра самае цікавае месца ў школе.

7. Калі б мы запрасілі сёння твайго настаўніка да нас у госці, што б ён мне расказаў пра цябе, як думаеш?

8. Каму ты сёння дапамог?

9. Можа, хтосьці табе сёння дапамог?

10. Раскажы мне, што новага ты даведаўся сёння?

11. Ці быў момант, калі ты адчуваў сябе самым шчаслівым сёння?

12. Што сёння было самым сумным у школе? Ці было табе сёння сумна?

13. З кім бы ты хацеў пагуляць на перапынку з тых, з кім ты яшчэ ніколі не гуляў?

14. Пра што ты яшчэ больш хацеў бы даведацца ў школе?

15. Чаго б табе хацелася менш рабіць у школе?

16. Чым ты часцей за ўсё займаешся на перапынках?

17. Хто самы смешны вучань у вашым класе? Чаму ён такі смешны?

18. Табе спадабаўся сённяшні абед? Што больш за ўсё спадабалася?

19. Ты лічыш, настаўніца сёння была несправядлівай? Чаму?

20. Калі б заўтра ты стаў настаўнікам, што б ты зрабіў?

Падрыхтавала Наталля МАЎЧАНАВА

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

«Ружы» з бліноў

Спатрэбіцца: *яйка курынае — 2 шт., мука — 2 ст. л., крухмал — 2 ст. л., соль (дробка), малако — 250 мл, алей — 1 ст. л., шакалад — 50 г, цукар (+ каляровы для ўпрыгожвання) — 50 г, масла сметанковае — 50 г.*

Яйкі разбоўтаць з дробкай солі. Дадаць муку і крухмал, змяшаць. Паступова ўвесці малако і добра змяшаць да аднастайнасці. Затым уліць алей.

Пасмажыць тонкія блінцы. Кожны гатовы блін прамазаць маслам і пасыпаць цукрам. Блін скласці напалову, затым яшчэ напалам. Затым разрэзаць, як паказана на фота. З кожнага бліна атрымаецца 2 ружы: маленькая і вялікая.

Шакалад растапіць на вадзяной лазні. Можна выкарыстоўваць яркі густы джэм. Атрыманае «блін-кальцо» разразаем з аднаго боку. На край бліна пэндзлікам наносім шакалад або джэм. Затым згортваем рулетам, фармуючы ружу.

Затым выкладваем ружы на талерку і ўпрыгожваем па жаданні.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

Салодкі падарунак

Прыгожая каробка цукерак — гэта, безумоўна, прыемна, але даволі банальна. А прыклаўшы трохі старання, можна і звычайныя цукеркі падарыць з асаблівай вытанчанасцю ў выглядзе торта.

Нам спатрэбіцца: кавалак пенапласту або любога іншага шчыльнага матэрыялу; гафрыраваная папера розных колераў і адценняў; клей ПВА (можна выкарыстоўваць гарачы пісталет); скотч двухбаковы; цукеркі (любыя).

З пенапласту выразаем круглую аснову неабходнага дыяметра. Можна зрабіць аснову і з кардону ці выкарыстоўваць гатовую, напрыклад, пачак з-пад пячэння ці цукерак. Што датычыцца формы вырабу, то тут таксама ніякіх абмежаванняў.

Атрыманую нарыхтоўку абклейваем паперай. Колер выбіраем у залежнасці ад тону этыкетак цукерак. Замест паперы можна таксама выкарыстоўваць каляровую фольгу. Пасля абклейвання пакідаем наш будучы торцік падсохнуць на некалькі гадзін.

Каб торт выглядаў больш акуратным, кончыкі на абгортках цукерак з абодвух бакоў шчыльна закручваем. Іх не павінна быць відно.

Пасля таго, як аснова высахла, можна прыступаць да прыклейвання цукерак. Для гэтага бяром двухбаковы скотч і лепім яго на бакавую паверхню асновы. На яго мы і будзем мацаваць нашы цукеркі.

Ахоўную паперу з двухбаковага скотча можна здымаць не ўсю адразу, а па меры прыклейвання цукерак. Так мы пазбегнем наліпання непатрэбнага смецця, і клейкая аснова не высахне. Каб торт атрымаўся роўным і прыгожым, цукеркі трэба шчыльна размяшчаць адна да адной.

Калі ўсе цукеркі будуць на сваім месцы, неабходна ўпрыгожыць паверхню торта. Можна выкарыстоўваць розныя дэкаратыўныя элементы: папяровыя кветкі, мяккія цацкі і г. д. Не бойцеся прыдумляць, арыгінальнасць заўсёды вітаецца.

КАХАННЕ НЕ ЦЕРПІЦЬ ТЛУМАЧЭННЯЎ. ЯМУ ПАТРЭБНЫЯ ЎЧЫНКІ (Эрых Марыя Рэмарк).

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

КАНТАКТ
№ 2 (42)
Спецпраект газеты «Звязда» сумесна з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук»

■ Філатэлія

МІНІЯЦЮРЫ З СУСЛІКАМ І БУСЛОМ

Самыя папулярныя маркі ў калекцыянераў — з выявамі жывёл і раслін

Беларускія маркі зноў прызналі адными з найлепшых у свеце. На Азіяцкай міжнароднай філатэлістычнай выставе «CHINA 2016» наша экспазіцыя ўдзельнічала ў 14-м міжнародным конкурсным класе і была ўзнагароджана сярэбраным медалём. Прыз прысудзілі паштовай прадукцыі, выпушчанай з 2013 па 2015 год. Чым адметная беларуская філатэлія? Пра гэта мы даведаліся ў начальніка выдавецкага цэнтра «Марка» прадпрыемства «Белпошта» Ірыны ШЫПІЛАВАЙ.

У форме трохвугольніка

Крыху гісторыі. Першая ў свеце дзяржаўная марка была выпушчана ў Вялікабрытаніі 6 мая 1840 года. Яе назвалі «Чорны пені» праз колер друку і кошт у адзін пені. Роданачальнікам маркі лічаць сельскага настаўніка Роўленда Хіла, які пазней стаў каралеўскім генеральным паштмайстрам.

Гісторыя беларускай філатэліі пачынаецца з 20 сакавіка 1992 года. У той дзень была выпушчана ў абарачэнне першая айчынная паштовая мініяцюра «Крыж Еўфрасінні Полацкай». Спачатку маркі тыражаваліся ў Расіі, а з 1995 года вытворчасць дзяржаўных знакаў паштовай аплаты наладжана ў Беларусі. Маркі надрукавалі ў выдавецтве «Беларускі Дом друку»: яны выйшлі ў абарачэнне 4 мая 1995 года і былі прысвечаны 50-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

На сёння ўведзена амаль 1200 беларускіх марак. Штогод выпускаецца каля 50 сюжэтаў мастацкіх паштовых мініяцюр. На іх адлюстраваны сучасныя рэаліі дзяржавы, гістарычная і культурная спадчына, багатыя флора і фаўна.

Кніга «Паштовыя маркі Рэспублікі Беларусь. 2015» стала дыпламантам нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», які праводзіўся ў рамках XXIV Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу.

Паштовы блок з Дар'яй Домрачавай быў прызнаны найлепшай маркай 2014 года.

— Апошнія гады выдавецкі цэнтр «Марка» працуе па некалькіх кірунках, — расказвае Ірына Шыпілава. — З аднаго боку, павышаюцца патрабаванні да распрацоўкі арыгінал-макетаў марак і іх вырабу. З другога — аптымізаваны формы выпуску: зроблены ўхіл на «зручныя» памеры марачных лістоў, прадугледжана наяўнасць купонаў і па-мастацку аформленых палёў. Беларускія маркі сталі «больш прыбранымі». Пры іх вырабе прымяняюцца паслядрукарскія паліграфічныя тэхналогіі: выбарачная лакіроўка, тэрмічнае цісненне металізаванай фольгай і іншыя. З'явіліся незвычайныя паштовыя маркі — у выглядзе трохвугольніка, круга, авала. Безумоўна, гэта вялікі крок наперад.

Экспарт у 60 краін

— Улічваючы багатую тэматыку выпускаў і высокае паліграфічнае выкананне, можна з упэўненасцю сказаць, што беларускія маркі цікавыя айчынным і замежным калекцыянерам. Адгрузка нашага філатэлістычнага матэрыялу на экспарт ажыццяўляецца ў 60 краін, — адзначае Ірына Шыпілава.

Найбольш папулярная і запатрабаваная тэма ў сусветнай філатэліі — флора і фаўна. Прыкладна траціна беларускіх марак прысвечана гэтай тэме. На паштовых мініяцюрах шырока прадстаўлена тэма запаведных тэрыторый. На марках розных гадоў паказаны Бярэзінскі біясферны запаведнік, Белавежская і Налібоцкая пушчы, Нацыянальныя паркі «Прыпяцкі», «Нарачанскі», «Браслаўскія азёры».

Раз на пяць гадоў беларуская пошта атрымлівае дазвол на выкарыстанне лагатыпа Сусветнага фонду прыроды (WWF) на марках з адным з рэдкіх відаў фаўны краіны. У супрацоўніцтве з гэтым фондам былі выдадзены серыі, прысвечаныя еўрапейскаму бабру, еўрапейскай рысі, чорнаму буслу і рагатаму дзедку (від стракоз). У 2015-м пад эгідай WWF выпусцілі маркі серыі «Рабы суслік».

Штогод выходзіць мастацкая паштовая мініяцюра «Птушка года Беларусі». Маркі гэтай серыі маюць свой стыль: яны выдаюцца невялікімі марачнымі лістамі з купонамі і мастацкім афармленнем палёў у дадатак. Традыцыйна да кожнага выпуску вырабляецца паштовая картка для картмаксімуму (на пярэднім баку такой карткі наклеена марка таго ж малюнка і стаіць штэмпель). Летась на мініяцюры быў намаляваны гогаль звычайны.

— Беларуская пошта ўлічвае інтарэсы калекцыянераў і выпускае шырокі спектр філатэлістычнай прадукцыі. Гэта канверты Першага дня, спецыяльныя памятныя гашэнні, картмаксімумы рознай тэматыкі. Арганізаваны выраб тэматычных і гадавых набораў, буклетаў і іншых паштовых сувеніраў, — расказвае Ірына Шыпілава. — Трэба адзначыць, што маркі, будучы калекцыйным матэрыялам, не толькі не губляюць з гадамі сваёй матэрыяльнай каштоўнасці, а наадварот, набываюць яе. Выпушчаныя пэўным тыражом, яны раскупляюцца, колькасць іх у продажы пастаянна змяншаецца, а попыт павялічваецца.

Водгук і ідэі кліентаў

Вызначыць найлепшую сярод беларускіх марак, выпушчаных летась, можа любы ахвотны. Конкурс-апытанне праходзіць з 20 лютага па 20 сакавіка. Анкету можна запоўніць на сайце Белпошты або ў любым аддзяленні сувязі краіны.

Сярод пераможцаў мінулых гадоў — паштовыя блокі «1025-годдзе Хрышчэння Русі», «Дар'я Домрачава — трохразовая алімпійская чэмпіёнка XXII зімовых Гульняў у Сочы (біятлон). Герой Беларусі», «70 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне».

— Мы заўважылі наступную тэндэнцыю: найлепшымі выпускамі становяцца паштовыя блокі. Але гэта хутчэй тэхнічная асаблівасць, бо блок складаецца з маркі і мастацкага поля, а таму змяшчае больш ілюстраванага матэрыялу, — кажа Ірына Шыпілава. — Штогадовы конкурс — гэта ўнікальная магчымасць атрымаць зваротную сувязь ад пакупнікоў. Кожнае пажаданне ці заўвага не застаецца без увагі. У выніку посткросеры падказалі шмат ідэй для мастацкіх картак і паштовых марак.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

Служым закону, народу, айчыне

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 24 лютага выпускае ў абарачэнне паштовы блок, прысвечаны 100-годдзю беларускай міліцыі, бо менавіта ў далёкім 1917-м, 4 сакавіка, грамадзянскі камендант Мінска падпісаў загад, згодна з якім М.В. Фрунзэ прызначаўся часовым начальнікам міліцыі Усерасійскага земскага саюза па ахове парадку ў горадзе... Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Міністэрствам унутраных спраў. Дызайн Таццяны Кузняцовай. У дзень выпуску паштовага блока ў аддзяленні сувязі №1 Мінска (крама «Філатэлія»), вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце.

Вясенні настрой ад паштавікоў

Стала добрай традыцыяй у Мінскім філіяле Белпошты напярэдадні свят ладзіць разнастайныя акцыі для кліентаў. Напрыклад, у аддзяленнях паштовай сувязі Барысаў-5 па вуліцы Працы, 5, Дзяржынск-2 (вуліца Талстога, 4), Слуцк-9 (вуліца М. Багдановіча, 2), Салігорск-7 (вуліца Казлова, 31) пры набыцці 6 сакавіка прадукцыі на пэўную суму кліент атрымае ў падарунак дзве віншавальныя паштоўкі.

— Гэтае прома-мерапрыемства мы назвалі «Вясенні настрой». Яно стане добрай нагодай павіншаваць родных і блізкіх са святам, знамянальнай падзеяй у іх жыцці, напісаць на паштоўках у іх адрас цёплыя і пяшчотныя словы. Падчас мерапрыемства спецыялісты раскажуць кліентам аб магчымасцях перасылкі адпраўленняў паскоранай поштай EMS Belpost, — растлумачыла **начальнік аддзела маркетынгу і прасоўвання паслуг філіяла Валянціна ЕСІПОВІЧ.**

Акрамя таго, прапануецца акцыя і ад паштовага інтэрнэт-магазіна «Перасылка — у падарунак!». Толькі 1 сакавіка пры афармленні заказу на любую суму наведвальнік атрымае 100-працэнтную зніжку на яго перасылку да аддзялення паштовай сувязі па месцы жыхарства.

— Заўсёды даступная і актуальная інфармацыя з лепшымі цанавымі прапановамі ёсць у раздзелах: зніжкі, навінкі і хіты продажу. Афарміць заказ можна ў любым аддзяленні Белпошты, на сайце shop.belpost.by або па тэлефоне 8017 220-56-32 з дастаўкай па ўсёй краіне. Аплаціць тавар можна рознымі спосабамі: банкаўскай карткай, карткай растэрміноўкі «Халва», пры афармленні заказу ў аддзяленні паштовай сувязі або пры атрыманні — гатоўкай, — запрашае Валянціна Есіповіч.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

Самы знакаміты адрасат

Гродзенскі філіял Белпошты сёлета парадаваў і яшчэ парадуе жыхароў новых мікрараёнаў. Нядаўна адбылося наваселле паштовага аддзялення ў Астраўцы па вуліцы Уладзіміра Караткевіча. Горад будучых атамшчыкаў пастаянна расце, будуецца жыллё, інфраструктура, таму чарговы паштовы аб'ект асабліва актуальны для новага мікрараёна. На чарзе адкрыццё яшчэ аднаго аддзялення сувязі ў мікрараёне Альшанка абласнога цэнтра. У пачатку сакавіка ён пачне дзейнічаць па вуліцы Напалеона Орды.

Як паведаміла **намеснік дырэктара Гродзенскага філіяла прадпрыемства «Белпошта» Святлана МЯКІШ**, усяго на тэрыторыі рэгіёна працуе 383 аддзяленні паштовай сувязі, з якіх большасць — 265 — у сельскай мясцовасці. Для юрыдычных асоб адкрыта 7 бізнес-філіялаў. Новыя аддзяленні будуць аказваць тыя ж паслугі, як і цэнтральныя гарадскія пошты.

Асаблівасцю сталі выпуск і продаж стылізаваных паштовак з відамі старога Гродна, распрацаваных на аснове матэрыялаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея. Пакуль такія паштоўкі можна набыць у гарадах, куды часцей прыязджаюць замежныя турысты. З увядзеннем бязвізавага ўезду попыт на сувенірную прадукцыю, у тым ліку і друкаваную, расце.

Святлана Мякіш паведаміла, што гродзенцы актыўна карыстаюцца паштовай сувяззю, удзельнічаюць у папулярным руху «посткросінг». Як правіла, для сваіх карэспандэнцый многія выбіраюць канверты і паштоўкі з выявамі адметных падзей рэгіёна альбо вядомых асоб. Дарэчы, друкаваная прадукцыя з унікальным штэмпелем карыстаецца попытам і ў калекцыянераў. Так, летась прайшоў чарговы фестываль нацыянальных культур. Да гэтай даты нават была ўстаноўлена стылізаваная пад даўніну каваная паштовая скрыня, выдадзены канверт з сімволікай фестывалю. Маюць попыт і канверты з вобразамі знакамітых гродзенцаў — Максіма Багдановіча, Элізы Ажэшкі, Льва Бакста, Міхала Агінскага і іншых.

У мінулым годзе самым папулярным адрасатам Гродна стаў прызёр Алімпіяды Іван Ціхан. Для яго была створана абаненцкая скрыня, куды гродзенцы накіравалі больш за 10 тысяч лістоў з пажаданнямі і віншаваннямі. Цяпер уся карэспандэнцыя знаходзіцца ў гродзенскім музеі пошты.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

■ Падрабязнасці

Сочым за пасылкай праз тэлефон

Плануецца выпусціць мабільную паштовую праграму

З яе дапамогай карыстальнікі змогуць адсочваць адпраўленні, рабіць плацяжы, выклікаць паштовага кур'ера, паведаміў **генеральны дырэктар Белпошты Уладзімір МАТУСЕВІЧ.**

Кліентам прадпрыемства таксама стануць больш даступныя паслугі паштаматаў — устройстваў для адпраўкі і атрымання пасылак. Комплексы ўжо тэсціруюцца спецыялістамі. На першым этапе ў Мінску з'явіцца 11 такіх устройстваў. У далейшым плануецца пашырыць сетку паштаматаў да 20.

Сёлета прадпрыемства будзе актыўна ўдзельнічаць у інтэрнэт-гандлі. Уладзімір Матусевіч патлумачыў, што ў хуткім часе яны наладзяць супрацоўніцтва з шэрагам краін СНД, у першую чаргу з Расіяй, каб арганізаваць магчымасць набыцця беларускіх тавараў, у тым ліку непасрэдна на інтэрнэт-пляцоўцы Белпошты.

Абслужыць на «выдатна»

Раённы паштальён стала «Чалавекам года Віцебшчыны»

За дасягненне высокіх паказчыкаў у рабоце і падтрымку належнага ўзроўню якасці паслуг у 2016 годзе ў намінацыі «Энергетыка, транспарт, камунікацыі» ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» атрымала Жанна Стальмаховіч, паштальён 4 разраду аддзялення сувязі Новая Зара Чашніцкага раённага вузла сувязі Віцебскага філіяла Белпошты.

Жанна Міхайлаўна працуе ў гэтым аддзяленні з 1995 года. Кліенты і калегі ведаюць яе як кваліфікаванага і адказнага работніка, які шмат увагі надае якаснаму абслугоўванню насельніцтва. Жанна Стальмаховіч «хварэе» за вынікі працы ўсяго калектыву Чашніцкага раённага вузла паштовай сувязі, з'яўляецца настаўнікам моладзі, карыстаецца заслужаным аўтарытэтам і павагай, актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці прадпрыемства.

Ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» штогод прысвойваюць, каб узнагародзіць людзей за заслугі ў садзейнічанні рэалізацыі сацыяльнай і эканамічнай палітыкі дзяржавы і органаў мясцовага кіравання, забеспячэнні законнасці і правапарадку, за дасягненні ў галіне навукі, адукацыі і культуры, актыўную грамадскую дзейнасць. 100 найлепшых прадстаўнікоў рэгіёна атрымліваюць дыпломы лаўрэатаў і грашовую прэмію. Акрамя таго, білборды з іх фатаграфіямі на працягу года ўпрыгожваюць населеныя пункты вобласці.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 77-го ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже земельных участков в Солигорском районе 27 марта 2017 года

№ лота	1	2	3	4
Предмет аукциона	земельный участок в частную собственность			
Адрес земельного участка	г. Солигорск, пер. Сосновый, 9	г. Солигорск, пер. Сосновый, 10	г. Солигорск, пер. Сосновый, 11	Солигорский р-н, г.п. Старобин, ул. Гуляева, район дома №87
Кадастровый номер	625050100001003046	625050100001003047	625050100001003048	625056200001001943
Площадь, га	0,1112	0,1062	0,1037	0,1554
Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение)	размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома)			
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории*	имеется подъезд с песчано-гравийным покрытием, возможность подключения к сетям связи, газоснабжения, электроснабжения, канализации, водопровода			имеется подъезд с гравийным покрытием, возможность подключения к сетям газоснабжения, электроснабжения, телефонизации
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	охранные зоны линий связи и радиофикации – 0,0042 га, сетей и сооружений канализации – 0,0112 га	охранные зоны линий связи и радиофикации – 0,0006 га, сетей и сооружений канализации – 0,0124 га	охранные зоны линий связи и радиофикации – 0,0004 га, сетей и сооружений водоснабжения – 0,0061 га	охранные зоны электрических сетей – 0,0314 га
Начальная цена продажи, руб.	12 021,74	11 481,20	11 210,92	8 556,62
Сумма задатка, руб.	2 404,00	2 296,00	2 242,00	1 711,00
Условия продажи	1. Обеспечить соблюдение требований Градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства; 2. См. пункт 6			
Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.	1 818,84	1 733,73	1 903,06	1 655,15
	+ затраты на объявление в СМИ, оплата услуг аукциониста			

N лота	5	6
Предмет аукциона	право заключения договора аренды земельного участка	
Адрес земельного участка	г. Солигорск, ул. Коржа	г. Солигорск, ул. Центральная
Кадастровый номер	625050100001001596	625050100001003010
Площадь, га	0,0030	0,1760
Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение)	размещение объектов розничной торговли (установка и эксплуатация торгового киоска)	размещение объектов иного назначения, здравоохранения и предоставления социальных услуг, финансового назначения, бытового обслуживания населения (строительство многофункционального здания с обязательным размещением аптеки, пункта банковских услуг, объекта бытового обслуживания населения)
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории*	имеется транспортная и инженерная инфраструктура	имеются асфальтированные подъездные пути, возможность подключения к сетям связи, канализации, электроснабжения, газоснабжения
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	ограничений в использовании земель нет	придорожные полосы (контролируемые зоны) автомобильных дорог, охранные зоны линий связи и радиофикации – 0,0051 га, электрических сетей – 0,0031 га
Начальная цена продажи, руб.	744,87	9 480,85
Сумма задатка, руб.	148,00	1 896,00
Срок аренды земельного участка / условия продажи	5 лет / см. пункт 6	10 лет / 1. Обеспечить соблюдение требований Градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства; 2. См. пункт 6
Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.	11,50	2 804,39
	+ затраты на объявление в СМИ, оплата услуг аукциониста	

*в разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.

Продавец: Солигорский районный исполнительный комитет, 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.

Порядок проведения аукциона и порядок оформления участия в торгах определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462.

1. Аукцион состоится в 15.00 27 марта 2017 года по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.

2. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

2.1. заявление на участие в аукционе по установленной форме; при подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности) – паспорт;

2.2. копии устава, учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов (для юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования (для индивидуальных предпринимателей), копию паспорта, выписку об открытии в филиале 633 АСБ «Беларусбанк» лицевого счета для возврата задатка (для физических лиц);

2.3. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет Солигорского райисполкома (УНН 601061003) № 3641000004297 в филиал 633 АСБ «Беларусбанк», код 969, с отметкой банка;

2.4. гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо заключает с Солигорским районным исполнительным комитетом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме;

2.5. к участию в аукционе по лотам №№ 1-4 допускаются граждане Республики Беларусь и юридические лица.

3. По лотам №№ 5, 6 осуществляется ежегодная уплата арендной платы согласно кадастровой стоимости земельного участка и его целевому назначению, по лотам №№ 1-4 – ежегодная уплата земельного налога согласно законодательству.

4. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельными участками и документацией.

5. Аукцион по каждому лоту состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену.

6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона (в счет оплаты засчитывается сумма внесенного задатка), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;

не позднее 2 рабочих дней после совершения оплаты заключить с райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок, после его заключения, государственную регистрацию права на земельный участок;

юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю не позднее 6 месяцев, а гражданину не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта, приступить к освоению земельного участка;

в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок получить в отделе архитектуры и строительства райисполкома техническую документацию на строительство объекта;

получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта в срок, не превышающий двух лет;

осуществить строительство жилого дома – в сроки, установленные законодательством, иного объекта – в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

7. Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, кабинет 244, с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 21 марта 2017 года включительно, тел.: 8(0174) 22 77 46, 22 55 23

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает об открытом аукционе по продаже гаража, обращенного в доход государства, г. Минск, ул. Володько, 30-238

Наименование	Начальная цена продажи, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
Лот №1. Изолированное помещение с инв. №500/D-689545. Наименование: гараж. Адрес: г. Минск, ул. Володько, 30-238. Г.п. – 2004. Этажность – 1. Общая площадь – 24,8 кв. м. Стены – кирпичные, ж/бетонные панели. Перекрытия – ж/бетонные плиты. Полы – бетонные. Проемы – ворота металлические. Электроснабжение – есть	18 257,40	1 820,00
Шаг аукциона 5%		
УСЛОВИЯ		
1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.		
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.		
